Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
5 ВЕРАСНЯ 2020 г. СУБОТА
№ 173 (29287)
# ЗВЯЗДА

## АСАБЛІВАЯ ПАДЗЕЯ Ў КУЛЬТУРНЫМ ЖЫЦЦІ

***Удзельнікам і гасцям Дня беларускага пісьменства***

*Шаноўныя сябры!*

*Шчыра вітаю ўдзельнікаў і гасцей Дня беларускага пісьменства.*

*Гэта свята — асаблівая падзея ў культурным жыцці Беларусі. На яго пляцоўках адбываецца шматгалосы дыялог майстроў пяра — пісьменнікаў і паэтаў — пра лёс слова і культуры, сучаснасць і будучыню нашага народа. Тут сустракаюцца, узбагачаючы творчую ніву, літаратура, музыка, жывапіс і іншыя віды мастацтва.*

*Сёлета адно з самых славутых свят незалежнай Беларусі гасцінна вітаюць старажытныя Бялынічы — вядомы цэнтр духоўнасці зямлі беларускай, адметны куток Магілёўшчыны з багатай гісторыяй і надзвычай прыгожай прыродай, знакаміты сваімі таленавітымі творцамі, сярод якіх мастак Вітольд Бялыніцкі-Біруля.*

*Упэўнены, гэтыя вераснёўскія сустрэчы — добрая падстава для кожнага з удзельнікаў і гасцей Дня пісьменства яшчэ раз зразумець, што беларусаў, якіх бы поглядаў яны ні прытрымліваліся, заўсёды аб'ядноўваюць матчына мова, адзіны лёс і Бацькаўшчына. І гэты каштоўны скарб-спадчыну мы павінны зберагчы для нашчадкаў.*

*Сардэчна жадаю ўсім моцнага здароўя, дабрабыту, новых здабыткаў у жыцці і працы.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# Вялікае падарожжа ў Бялынічы









Бялыніцкі край рыхтуецца да штогадовай духоўнай урачыстасці, а сам раённы цэнтр — Бялынічы ў гэтую нядзелю стане сталіцай Дня беларускага пісьменства. Атрымаўшы свой пачатак у 1994 годзе ў Полацку, на малой радзіме славутых Францыска Скарыны і Ефрасінні Полацкай, свята здзейсніла вялікае падарожжа па гарадах і мястэчках нашай Бацькаўшчыны. Гэта былі Навагрудак і Слонім, Тураў і Пінск, Орша і Глыбокае, Шклоў і Мсціслаў, Барысаў і Заслаўе, іншыя паселішчы. Старажытная зямля на беразе імклівай Іпуці — Бялынічы вядомыя з 1577 года — упіша ў свой летапіс, што дваццаць сёмы раз гэтае свята сустракалі і адзначалі менавіта тут.

А Выдавецкі дом «Звязда», як заўсёды, стане ўдзельнікам гэтай урачыстай нагоды, каб сустрэцца са сваімі сталымі падпісчыкамі і чытачамі, а таксама пасябраваць з новымі.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Ва ўрадзе

## Новыя пасады, новыя задачы

**Ураду прадставілі Анатоля Сівака — новага намесніка прэм'ер-міністра. Былога старшыню Мінгарвыканкама з супрацоўнікамі апарата Савета Міністраў пазнаёміў прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка, перадае БелТА.**

«Анатоль Сівак — не новы чалавек ва ўрадзе. Ён шэсць гадоў працаваў міністрам транспарту і камунікацый, больш за 23 гады — у сістэме транспарту, пачынаючы з майстра і заканчваючы начальнікам такога магутнага арганізма, як Беларуская чыгунка. Быў і памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Мінску. Таксама два гады ўзначальваў самы вялікі горад нашай краіны», — звярнуў увагу Раман Галоўчанка.

Ва ўрадзе Анатоль Сівак на пасадзе віцэ-прэм'ера будзе адказваць за пытанні будаўніцтва, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, транспарту, Міністэрства па падатках і зборах і часткова Дзяржпагранкамітэта. «Разлічваю, што той вопыт і веды, якія ёсць у Анатоля Аляксандравіча, дапамогуць яму вырашаць увесь няпросты комплекс задач, якія стаяць перад гэтымі важнымі сферамі», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Раман Галоўчанка, гаворачы пра былога віцэ-прэм'ера і цяперашняга мэра Мінска Уладзіміра Кухарава, падкрэсліў, што ён больш за два гады верай і праўдай служыў на карысць краіны, вырашаў шмат складаных пытанняў. «Уладзіміра Яўгенавіча вызначае нацэленасць на канкрэтны вынік, ён не баіцца браць на сябе адказнасць. Гэтыя якасці яму вельмі дапамогуць на новай пасадзе», — падкрэсліў Раман Галоўчанка і дадаў, што кіраваць такім горадам, як Мінск, дастаткова складана, асабліва цяпер.

Новы намеснік прэм'ер-міністра адзначыў, што сферы, якія ўваходзяць у зону яго адказнасці, датычацца штодзённага жыцця людзей. «Яны вельмі рэгламентаваныя. Гэта зразумела, паколькі бяспека на першым месцы. Удасканаленне гэтых рэгламентаў, розных нарматыўных дакументаў дасць магчымасць зрабіць узаемадзеянне ў гэтай сферы больш сучасным і больш эфектыўным — вось галоўная задача на сёння», — сказаў ён.

Учора таксама дэпутаты Мінскага гарадскога Савета зацвердзілі Уладзіміра Кухарава на пасадзе старшыні Мінгарвыканкама, перадае БелТА. Новага мэра прадставіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка. Ён расказаў пра дасягненні і дзейнасць былога віцэ-прэм'ера на папярэдняй пасадзе.

«Ва ўрадзе Уладзімір Яўгенавіч курыраваў пытанні жыллёва-камунальнай гаспадаркі, транспарту, будаўніцтва. Гэта тыя сферы, якія сёння з'яўляюцца аднымі з прыярытэтных у сістэме гарадской гаспадаркі і ў цэлым жыццядзейнасці Мінска. Пад яго непасрэдным кіраўніцтвам праводзілася ўдасканаленне прававога рэгулявання жыллёвых адносін, прынятая новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса, праведзена вялікая работа па стварэнні неабходнай раўнацэннай базы па развіцці гарадоў-спадарожнікаў Мінска», — звярнуў увагу кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка.

## Ігар ЛУЦКІ: «Святло стваральнага пісьменства...»



Фота БелТА.

**Карэспандэнт «Звязды» у пярэдадзень XXVII Дня беларускага пісьменства ў Бялынічах задаў некалькі пытанняў міністру інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігару Уладзіміравічу ЛУЦКАМУ.**

***— Паважаны Ігар Уладзіміравіч, свята прыгожага пісьменства адлічвае ўжо другую чвэрць стагоддзя. Вы ўдзельнік і арганізатар не аднаго такога Дня пісьменства. Якімі адрозненнямі характарызуецца сёлетняе свята ў Бялынічах?***

— Найлепшая характарыстыка любой традыцыі, якая мае паважаны ўзрост, — стабільнасць, трываласць. Без гэтага нельга ісці наперад, развівацца. Вось і гаворачы пра чарговую сустрэчу медыйшчыкаў, кніжнікаў, усіх, каго хвалюе лёс асветніцтва, трэба падкрэсліць гэта. Суадносіны друкаваных выданняў, кніг, мастацкага і публіцыстычнага слова, выкладзенага ў электронных СМІ, сацыяльных сетках, з грамадствам, яго сацыяльнымі і іншымі памкненнямі, — вось галоўны клопат, галоўная тэма размоў і дзеянняў. Канешне ж, штогод патрэбны навацыі. Іх наша галіновае міністэрства, якое так ці інакш судакранаецца з усёй краінай, разам з іншымі арганізатарамі свята, найперш — Магілёўскім аблвыканкамам, Бялыніцкім райвыканкамам вызначыла і выпрацавала досыць шмат. Не буду каментаваць усю праграму свята, а звярну ўвагу толькі на некаторыя «пункты». Усё ж залежыць ад сутнаснага насычэння. І спадзяюся, што літаральна ўсім гасцям свята, усім яго ўдзельнікам цікава будзе пазнаёміцца з праграмай, якую арганізатары прадставяць на пляцоўках «Кнігі і прэса Рэспублікі Беларусь», «Друкарскі двор», «Слова пісьменніка». Калі мы складалі іх праграму, то ўлічвалі розныя акалічнасці. Па-першае, усе мерапрыемствы, усе дзействы на гэтых пляцоўках ладзяць людзі, нераўнадушныя да друкаванага слова, да мастацкай, публіцыстычнай, асветніцкай кнігі. А гэта выдаўцы, журналісты, пісьменнікі, краязнаўцы, бібліятэчныя работнікі. Вось як быццам някідкі адрас свята — у межах духоўна-асветніцкага праекта «Дакрануцца да духоўнасці» будзе цэлы дзень 6 верасня працаваць літаратурна-тэатралізаваная інтэрактыўная пляцоўка тэматычных экспазіцый бібліятэк Магілёўскай вобласці. Зразумела ж, кожная з раённых цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм, бібліятэкары Магілёва, вобласці прадэманструюць далучанасць да агульнабеларускіх здабыткаў у галіне прыгожага пісьменства ўраджэнцаў Магілёўшчыны.

СТАР. 2

Разумныя грошы

## Каштоўныя паперы, якія прыносяць даход

**Сваю першую каштоўную паперу я набыў дзесьці 10 гадоў таму. Гэта была валютная аблігацыя Беларусбанка. Яна каштавала адну тысячу долараў і прадугледжвала даход — 7 % гадавых. Потым даходы банка пачалі падаць, і я зацікавіўся дзяржаўнымі каштоўнымі паперамі. А апошнім часам я набраўся смеласці і пачаў набываць карпаратыўныя аблігацыі. У чым іх адрозненне? Пастараемся разабрацца.**

### ДАЎГАВЫЯ РАСПІСКІ

Аблігацыі — гэта фактычна даўгавыя распіскі. Іх выпускае эмітэнт-кампанія (або дзяржава, яна таксама можа быць эмітэнтам), якой патрэбны грошы. Людзі купляюць аблігацыі і такім чынам даюць свае грошы ў пазыку гэтай кампаніі, разлічваючы атрымаць пэўны прыбытак. Поўная сума, тэрміны і памер выплат гэтага даходу (калі плануецца некалькі плацяжоў), як правіла, вядомыя пры куплі. Магчымасць загадзя ацаніць сваю выгаду — гэта тое, чым аблігацыя адрозніваецца ад іншых каштоўных папер.

Ва ўстаноўлены тэрмін адбываецца пагашэнне аблігацый, гэта значыць эмітэнт выплачвае іх уладальнікам намінальны кошт, указаны на саміх аблігацыях. Асноўная рызыка для інвестара — банкруцтва кампаніі-эмітэнта. У гэтым выпадку ён можа страціць укладзеныя грошы: у адрозненне ад дэпазітаў, яны не абаронены сістэмай страхавання ўкладаў.

Такім чынам, аблігацыі — фінансавы інструмент, які дапамагае захаваць сродкі і атрымаць пры гэтым умераны даход пры адносна невысокіх рызыках. Тым не менш гэтыя рызыкі кладуцца выключна на інвестара. Калі вы гандлюеце на біржы праз брокера, менавіта вы прымаеце канчатковае рашэнне аб куплі або продажы аблігацый і несяце за яго адказнасць.

СТАР. 3

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Улады Кіпра праверяць усе выдадзеныя за 18 гадоў «залатыя пашпарты»




Кіпр правядзе новую, больш маштабную праверку выдадзеных «залатых пашпартоў». Яна ахопіць усе 18 гадоў дзеяння праграмы выдачы грамадзянства за інвестыцыі. Аб гэтым паведаміў прадстаўнік урада краіны Кірыакас Коўсіас. Яго словы прыводзяцца на сайце службы інфармацыі і прэсы ўрада Кіпра. Нагодай для праверкі паслужыла расследаванне Al Jazeera, у якім сцвярджалася, што рэспубліка прадавала пашпарты сумніўным асобам, паведаміў Forbes. Для праверкі ўсіх выпадкаў выдачы грамадзянства за інвестыцыі будзе створана спецыяльная незалежная камісія. Яе фарміраваннем зоймецца генпракурор Кіпра. Па словах Коўсіаса, камісія атрымае «шырокія паўнамоцтвы для расследавання». Кошт пашпартоў складаў прыкладна 2,5 мільёна долараў. У матэрыялах Al Jazeera Кіпр быў прадстаўлены як краіна, якая прадавала пашпарты злачынцам за грошы, адзначыў партал Cyprus Property News. Пасля публікацый паліцыя пачала ўласнае расследаванне з мэтай знайсці крыніцу, якая перадала канфідэнцыйныя дакументы журналістам. Урад меркаваў, што ўцечка магла адбыцца праз супрацоўнікаў парламента, піша CyprusMail.

### Apple страціла за дзень $180 млрд капіталізацыі

Гэта рэкорднае дзённае зніжэнне кошту для любой кампаніі ў гісторыі амерыканскага рынку, паведаміла выданне Barron's. Тым не менш, капіталізацыя Apple па-ранейшаму істотна перавышае два трыльёны долараў. Без уліку 2020 года папярэдні антырэкорд быў устаноўлены Facebook, рынкавы кошт якога ў чэрвені 2018-га за адну сесію скараціўся на $119 млрд (акцыі патаннелі на 19 працэнтаў) з-за негатыўных прагнозаў фінансавых паказчыкаў на фоне скандалу з Cambridge Analytica. Акрамя таго, пару дзён у сакавіку 2020 года дзённае падзенне капіталізацыі Apple і Microsoft Corp. перавышала $150 млрд. Амерыканскія фондавыя індэксы завяршылі таргі ў чацвер рэзкім падзеннем на фоне самых істотных страт тэхналагічнага сектара за некалькі месяцаў. Апетыт інвестараў пагоршыўся пасля ралі рынку ў мінулым месяцы. «Тэхсектар доўгі час не рэагаваў на фундаментальныя фактары», — пракаментаваў сітуацыю CNBC эксперт Vital Knowledge Адам Крысафулі. Паперы Facebook патаннелі на 3,8 %. Кампанія паведаміла, што будзе блакаваць новую палітычную рэкламу ў сваёй сацсетцы за тыдзень да прэзідэнцкіх выбараў. Каціроўкі Alphabet упалі на 5,1 %, Amazon.com — на 4,6 %, Netflix — на 4,9 %, Microsoft — на 6,2 %.

### Атрыманы самыя дэталёвыя здымкі Сонца

Еўрапейскім вучоным удалося зрабіць самыя дэталёвыя ў гісторыі здымкі Сонца. Аб гэтым паведамляецца ў даследаванні, апублікаваным у часопісе Astronomy & Astrophysics. Здымкі атрыманы з дапамогай тэлескопа GREGOR, устаноўленага на востраве Тэнерыфэ ў Іспаніі. Оптыка абсталявання дазволіла спецыялістам разглядзець на паверхні нябеснага цела дэталі памерам да 50 кіламетраў. Вучоныя заявілі, што гэта ўражальны вынік, і нагадалі, што дыяметр Сонца складае каля 1,4 мільёна кіламетраў. Па словах астраномаў, гэта як калі б разглядзець з кіламетровай адлегласці малюсенькую іголку на футбольным полі. «Цяпер у нас ёсць магутны інструмент для вырашэння загадак Сонца», — заявіла прафесар Фрайбургскага ўніверсітэта (Германія) Святлана Бярдзюгіна. Новая оптыка GREGOR дазволіць астраномам дэталёва вывучаць магнітныя палі, канвекцыю, турбулентнасць, сонечныя плямы і іншыя з'явы, звязаныя з зоркай.

ISSN 1990 - 763X
20173>
9 771990 763008

## КОРАТКА

- **«Белавія» працягнула прыпыненне рэйсаў у Расію да 30 верасня.**
- Гульні краін СНД у Казані перанесеныя на 2021 год.
- **Беларускія аграрыі намалацілі амаль 7,9 млн тон збожжа.**
- Сертыфікаты на лекі з 2021 года будуць узаемна прызнавацца ўсімі краінамі ЕАЭС.
- **Памёр кінааператар Анатоль Лапшоў, які зняў «Прыгоды Шэрлака Холмса».**
- Новая стратэгія развіцця лічбавага банкінгу ў Беларусі будзе прынятая да канца года.

Рацыён здароўя

## СНЯДАНАК НА «ВЫДАТНА»!

### Чым карміць школьніка перад доўгім навучальным днём?



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

**Вось і прыйшоў верасень, і адно з пытанняў, якое першы восеньскі месяц дадаў мамам — пра паўнавартаснае харчаванне дзіцяці. Калі на працягу дня мы не ў сілах кантраляваць тое, што есць наша малое (а асартымент школьных буфетаў — гэта булачкі і шакаладныя батончыкі), то па меншай меры сняданак (і вячэра, але гэта ўжо зусім іншая гісторыя) — пакуль яшчэ ў нашай уладзе. Сняданак школьніка — які ён павінен быць? Пра гэта мы вырашылі спытаць спецыяліста па тэхналогіях збалансаванага і правільнага харчавання.**

СТАР. 3

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
Заставайцеся з намі — будзе цікава!
Пачалася падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Па сутнасці

# БОЛЬШ КАЗАЦЬ І ТЛУМАЧЫЦЬ

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла сустрэчу з актывам дэпутацкага корпуса Міншчыны.**



Фота БелТА.

Нагадаем, аналагічныя гутаркі раней ужо адбыліся ва ўсіх рэгіёнах краіны. Учора старшыні раённых Саветаў дэпутатаў Мінскай вобласці сабраліся ў верхняй палаце парламента, каб расказаць аб сацыяльна-эканамічнай і грамадска-палітычнай сітуацыі, якая складваецца ў рэгіёнах.

Наталля Качанава напачатку размовы падкрэсліла, што Савет Рэспублікі — орган тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, таму зразумела, чаму такая ўвага надаецца рэгіёнам: каб мець правільнае разуменне працэсаў, што там адбываюцца, для прыняцця аб'ектыўных рашэнняў і распрацоўкі карысных законапраектаў.

Па яе словах, дэпутацкі корпус усіх узроўняў — ад першаснага да членаў Савета Рэспублікі — валодае вялікім патэнцыялам, і рэзервы яго яшчэ не вычарпаны. Асабліва гэта датычыцца дзейнасці на рэгіянальным узроўні: менавіта на месцах дэпутаты сустракаюцца са сваімі выбаршчыкамі, даведваюцца аб праблемах сваёй акругі, вырашаюць розныя пытанні. Гэта, калі казаць фармальна, іх работа. Спікер верхняй палаты парламента перакanана, што спыняцца на гэтым не варта. Дэпутаты як абраннікі народа на сустрэчах з людзьмі могуць пераканаўча і аргументавана тлумачыць сутнасць працэсаў, якія адбываюцца сёння ў беларускім грамадстве. «Вы можаце данесці тыя асноўныя задачы, якія стаяць на адпаведным этапе развіцця нашай краіны», — упэўнена яна. Для гэтага варта больш актыўна і эфектыўна задзейнічаць рэсурс сродкаў масавай інфармацыі, якія ёсць у кожным з рэгіёнаў.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# «Гэта асаблівы прызыў у міліцыю»

**У пятніцу на плошчы Дзяржаўнага сцяга ў Мінску 437 першакурснікаў Акадэміі МУС прынеслі прысягу. Курсанты, якія стаялі ў страі, былі накіраваныя на вучобу рознымі ведамствамі. Акрамя падначаленых Міністэрства ўнутраных спраў тут рыхтуюцца спецыялісты для Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю і Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз.**

Сярод тых, хто павіншаваў курсантаў з гэтым днём, быў **міністр унутраных спраў Юрый КАРАЕЎ**. У размове з журналістамі ён адзначыў, што «гэта асаблівы прызыў у міліцыю».

— Хлопчыкі і дзяўчынкі свядома прыйшлі не толькі для таго, каб асвоіць прафесію, але і абараніць дзяржаву ў няпросты час. Кожны, хто хоць раз надзеў пагоны, памятае, што ён адказвае за дзяржаву. А вось перад мірнай і спакойнай краінай паўстала незвычайная задача — абараніць дзяржаўнасць — некалькі дзясяткаў чалавек пачалі вагацца. Гэтыя ж сотні маладых хлопцаў і дзяўчат прыйшлі на службу для свайго народа, свядома зрабіўшы свой выбар.

Курсанты будуць вучыцца чатыры гады. Перад тым у жніўні прайшоў вучэбны збор, дзе іх пазнаёмілі з азамі прафесійных ведаў.

**Аляксандр КАВАЛЁЎ.**

Экспертны асяродак

# «НА ЭМОЦЫЯХ НЕ ПАБУДУЕШЬ НЕШТА СТАНОЎЧАЕ ЦІ ТРЫВАЛАЕ»

**Сучасны беларускі інтэлігент — хто ён? Якая яго роля ў сённяшніх падзеях у грамадстве? Як знайсці ключы да дыялогу і кансалідаваць грамадства?**

Прадстаўнікі навуковай, царкоўнай і грамадскай супольнасцяў прынялі ўдзел у круглым стале «Беларуская інтэлігенцыя ў выпрабаваннях часу» сумеснага праекта БелТА і Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў «Экспертны асяродак».

У пачатку сустрэчы яе **мадэратар, сакратар Беларускага саюза журналістаў Вадзім ГІГІН, дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ, дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук, акадэмік Аляксандр ЛАКОТКА, протаіерэй, першы прарэктар Інстытута тэалогіі імя Святых Мяфодзія і Кірыла Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Сергій ГАРДУН** выказаліся наконт характарыстык асобы інтэлігента: безумоўна, ён у першую чаргу — патрыёт, які перажывае за лёс Айчыны, лідар са шчырай, сумленнай пазіцыяй, да якога ёсць давер. Неад'емныя рысы інтэлігента — памяркоўнасць, імкненне знаходзіць кампраміс, кансалідавацца ў вырашэнні задач. На думку акадэміка Аляксандра Лакоткі, нейкі апантаны, часовы азарт не здольны пранікнуць глыбока ў сутнасць нашай інтэлігенцыі, бо яна склалася гістарычна, мае глыбокія карані і спрадвечныя каштоўнасці.

## «Ні ў якім разе Царква не можа змагацца супраць улады»

Вадзім Гігін звярнуў увагу на пэўныя «падзелы», якія заўсёды існавалі ў асяродку інтэлігенцыі: на заходнікаў і ўсходнікаў, свядомых і несвядомых. У краіне і сёння існуюць два саюзы пісьменнікаў і два саюзы журналістаў. Адзінай, да шчасця, з'яўляецца Беларуская праваслаўная царква, якая вытрывала часы савецкага атэізму. Таму думкі прадстаўнікоў духавенства асабліва цікавыя ў рэчышчы тэмы, як пераадолець «падзелы».

Сапраўдным царкоўным інтэлігентам, на думку айца Сергія Гардуна, у паслярэвалюцыйны час з'яўляўся патрыярх Ціхан. «Яго пазіцыя была такая: мы можам даць маральную ацэнку ўладзе. Але ні ў якім разе хрысціяне, Царква не могуць змагацца супраць улады. Калі лідары белага руху прасілі яго даць блаславенне на вайну супраць Чырвонай арміі, ён штораз адмаўляўся і заклікаў да кампрамісу, перамоў», — згадаў святар. У сучаснай Беларусі ўзорам інтэлігента можа быць, па яго словах, мітрапаліт Філарэт, які заўсёды вытрымліваў узважаную пазіцыю. Як мяркуе айцец Сергій, Царква заўсёды імкнецца быць адзінай і застаецца такой, пакуль у яе не ўмешваецца палітыка.

«Тое, што адбылося на Украіне (раскол праваслаўя і заснаванне аўтакефаліі. — **«Зв.»**), мела месца з-за ўмяшальніцтва дзяржавы ў царкоўныя справы. У нас, дзякуй Богу, за ўсе гэтыя дзесяцігоддзі ніхто не імкнуўся парушыць царкоўны лад і сістэму. «Дабравольцаў», якія хацелі б разбурыць адзінства Царквы, адзінкі. Таму можна сказаць: такой праблемы няма», — упэўнены першы прарэктар Інстытута тэалогіі.

## «Дыялог на плошчы немагчымы»

Аляксандр Карлюкевіч звярнуў увагу на тое, што ў сённяшнім грамадстве спрэчка ідзе не з-за супярэчлівасці сацыяльна-эканамічных укладаў, а з прычыны барацьбы за палітычную ўладу на пэўным прамежку часу. Але нашае грамадства не падзелена. «Давайце не будзем разлучацца, мы ўсе яшчэ разам. У нас ёсць краіна, суверэнітэт, незалежнасць і, безумоўна, у нас ёсць вялікі гістарычны вопыт, які не абмяжоўваецца вопытам Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі», — заявіў дырэктар Выдавецкага дома «Звязда».

**«Можна сказаць, што нацыянальны характар беларусаў і ёсць падмурак для выйсця з любой складанай сітуацыі».**

Думку пра кансалідацыю працягнуў Вячаслаў Даніловіч. Па яго словах, дыялогу заўсёды знойдзецца месца ў грамадстве, але ён павінен грунтавацца на існуючых законах. «Мы не павінны выходзіць за рамкі законаў, бо інакш атрымліваецца проста хаос. Кожны будзе казаць тое, што хоча, і мы не будзем чуць адзін аднаго. Элементарная рэч у любым грамадстве — гэта законапаслухмянасць, — канстатаваў вучоны. — Зараз у нас абвешчаны змены ў Канстытуцыю. Давайце абмяркуем варыянт, які будзе распрацаваны. Мне падаецца, кожны будзе мець магчымасць выказацца, давесці сваю думку. Гэта нармальная практыка. Дыялог на плошчы немагчымы. Гэта эмацыйны ўсплёск, ён прысутнічае ў грамадстве, але на эмоцыях немагчыма пабудаваць нешта станоўчае ці трывалае». Спікер дадаў, што сапраўдны інтэлігент павінен умець уздымацца над сваімі эмоцыямі, «уключаць» розум, аналізаваць наступствы сваіх дзеянняў.

Па меркаванні протаіерэя Сергія Гардуна, у гэтыя тыдні асноўная місія інтэлігенцыі — тлумачыць неабходнасць дыялогу, бо не ўсе яе адчуваюць. «Калі людзі, нязгодныя з нейкімі парадкамі, усё-такі ўсвядомяць, што кампраміс магчыма знайсці, можна будзе выпрацаваць нейкую праграму. Гэта і стане выйсцем з сітуацыі», — дадаў ён.

## «Залог выйсця з любога крызісу»

У Сярэднія вякі вакол беларусаў, якія сфарміраваліся ў тыя часы як народ, заснавалася адзінства суседніх народаў: рускіх, украінцаў, палякаў, татараў, яўрэяў. Усе гэтыя супольнасці, па словах акадэміка Аляксандра Лакоткі, кансалідаваліся вакол ядра, што мела беларускую мову, культуру, самасвядомасць.

«Гэта трывалая аснова з унікальным гістарычным вопытам. Калі паглядзець праз стагоддзі, то насуперак войнам гэтая этнічная супольнасць не распалася, яе сіла захавалася да нашага часу, прайшла выпрабаванні XIX—XX стагоддзяў», — сказаў эксперт.

У адказ на разважанні акадэміка Вадзім Гігін заўважыў: «То-бок вы лічыце, што наш культурны код з'яўляецца залогам выйсця з любога крызісу і канфлікту?»

«Я люблю паўтараць, што ўсё гістарычна. Гэта не з'явілася ў часы нейкага кіраўніцтва, нейкай эпохі, а фарміравалася стагоддзямі ў драматычных умовах», — адказаў Аляксандр Лакотка.

«Можна сказаць, што нацыянальны характар беларусаў і ёсць падмурак для выйсця з любой складанай сітуацыі», — выказаў ідэю мадэратар сустрэчы.

«Для развітага народа гэта сапраўды так, для народа, які склаўся грунтоўна», — падсумаваў дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук.

Сергій Гардун звярнуўся да праблемы Злучаных Штатаў Амерыкі, дзе разгарнуліся супярэчнасці паміж афраамерыканцамі і насельніцтвам краіны з еўрапейскай знешнасцю. На яго думку, там прычыны канфлікту зразумелыя, а наша грамадства характарызуецца этнічнай аднароднасцю, канфесійнай талерантнасцю. І гэтыя паважлівыя адносіны — залог вырашэння любых сацыяльна-палітычных праблем краіны. Такую ідэю падтрымаў Аляксандр Лакотка. Па яго словах, асновай нашай кансалідацыі з'яўляецца славянскае адзінства, якое выключае падставы для латэнтнага крызісу.

«У сучасным свеце без саюза адной краіне выжыць немагчыма, у нас блізкія карані са славянскімі народамі. Нягледзячы на нейкія рэлігійныя перакананні, гэта глыбінная, стагоддзямі закладзеная аснова на генетычным узроўні працуе ў нашых народаў. Я думаю, што гэта аснова кансалідацыі», — выказаўся Вячаслаў Даніловіч.

Аляксандр Карлюкевіч упэўнены, што ў інтэлігенцыі, акрамя іншага, павінна заставацца і права быць творчымі адзінкамі. «Яна павінна браць удзел і ў вырашэнні клопатаў — дзяржаўных, агульнанацыянальных, клопатаў, звязаных з мірам, дабрынёй, сумленнасцю, з усімі тымі тэндэнцыямі, якія тысячагоддзямі былі ўпісаныя ў Евангеле», — рэзюмаваў рэдактар «Звязды».

**Марыя ДАДАЛКА.**

У цэнтры ўвагі

# Велапрабегі, працоўны дэсант і марафон мужнасці

**Вось ужо больш за два тыдні ў сталіцы, абласных і раённых цэнтрах праходзяць масавыя мерапрыемствы ў падтрымку міру і салідарнасці, бяспекі і спакою ў роднай сінявокай Беларусі. Яны збіраюць сотні і тысячы неабыякавых людзей, якія адкрыта кажуць пра тое, як важна захаваць спакой і парадак у краіне.**



У чацвер вечарам удзельнікі чарговай такой акцыі ў сталіцы сабраліся каля Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў. У руках мітынгоўцаў былі дзяржаўныя сцягі і плакаты ў падтрымку Прэзідэнта краіны. Гучалі лозунгі «За мірную Беларусь», «За Бацьку!», «Не дадзім разваліць краіну!».

У **Дзятлаве,** што на Гродзеншчыне, прайшоў велапрабег пад лозунгам «За любімую Беларусь».

Стартавалі веласіпедысты на стадыёне «Колас». Іх далейшы маршрут пралёг па вуліцах Перамогі, Чырвонаармейскай, Русіна, Фрунзэ, Прытыцкага, Кірава, Міцкевіча. Завяршыўся ён у кропцы старту.

З сабой у шлях дзятлаўчане ўзялі дзяржаўныя сцягі, чырвоныя і зялёныя паветраныя шары, сцяжкі з сімволікай грамадскіх аб'яднанняў «Белая Русь», «Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі», «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», і тым самым выказалі сваю грамадзянскую пазіцыю: за мір, стабільнасць і працвітанне.

Калону веласіпедыстаў суправаджалі супрацоўнікі дзяржаўтаінспекцыі.

**Нароўля** таксама далучылася да мерапрыемстваў у падтрымку міру, бяспекі і спакою патрыятычным велапрабегам. Пасля працоўнага дня 50 веласіпедыстаў розных узростаў і прафесій стартавалі ад плошчы Кастрычніцкай і праехалі арганізаванай калонай да бальніцы. Удзельнікі ўпэўненыя, што гучна заявіць аб асабістай грамадзянскай пазіцыі павінен кожны. Таму гэтым мерапрыемствам яны падкрэслілі гатоўнасць адстойваць інтарэсы краіны, яе суверэнітэт, незалежнасць, непадзельнасць і жаданне жыць спакойна ў мірнай краіне.

Мітынг «За Беларусь» пад лозунгам «Падтрымай сваю краіну» прайшоў таксама ў **Ваўкавыску.** Пра сваё жаданне не дапусціць развалу краіны, захаваць усё тое добрае, што створана ў апошнія дзесяцігоддзі, заявілі на мітынгу «За Беларусь», які прайшоў каля будынка мясцовага райвыканкама. Да прысутных звярнуліся прадстаўнікі мясцовай улады, прафсаюзаў, грамадскіх аб'яднанняў і проста неабыякавыя людзі. Выступленне кожнага з іх было эмацыянальным і шчырым. Адчувалася, што кожны з прысутных гаворыць ад душы і сапраўды перажывае аб тым, што адбываецца ў краіне сёння.

Моладзь **Брэста** ў межах мірных акцый арганізавала патрыятычны праект «Марафон мужнасці», які стартаваў аўтапрабегам па памятных мясцінах, звязаных з гісторыяй камсамола Беларусі. Лідары і актывісты маладзёжнага руху Брэстчыны разам з ветэранамі камсамолу ўшанавалі памяць усіх змагароў за свабоду і незалежнасць Радзімы — усклалі кветкі да брацкай магілы савецкіх воінаў у гарадскім парку абласнога цэнтра. Затым яны накіраваліся ў Івацэвіцкі раён. Менавіта там, ва ўрочышчы Ханшчына, падчас акупацыі дзейнічаў Брэсцкі падпольны абкам камсамолу. Зараз на згаданым месцы знаходзіцца мемарыяльны комплекс партызанскай славы. Там прайшла рэканструкцыя камсамольскай канферэнцыі ва ўмовах падполля.

А вось моладзь райцэнтра **Калінкавічы,** што ў Гомельскай вобласці, па-свойму далучылася да мірных акцый — яна паўдзельнічала ў працоўнай акцыі «За Беларусь». Больш за паўсотні маладых людзей і дзяўчат, навучэнцаў Палескага каледжа і Калінкавіцкага ліцэя, правялі маштабную ўборку памятных мясцін, звязаных з няпростай гісторыяй нашай краіны.

Па форме мясцовая працоўная акцыя — гэта суботнік, хоць і праходзіла яна ў чацвер. У спісе пляцовак — пахаванні воінаў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, магілы ветэранаў на мясцовых могілках, помнік воінам-інтэрнацыяналістам і помнік ліквідатарам аварыі на ЧАЭС.

Сучасная беларуская моладзь займае актыўную грамадскую пазіцыю, паважае дзяржаўныя каштоўнасці і выступае за стабільнае развіццё нашай краіны, падкрэслівае **першы сакратар раённай арганізацыі БРСМ Таццяна АРГУНОВА-ВЯКО:**

— Мы сёння жывём у анлайн-эпоху, частка жыцця перамясцілася ў інтэрнэт — гэта натуральны працэс тэхналагічнага развіцця грамадства. Аднак, на жаль, праз розныя інфармацыйныя каналы зараз нагнятаецца абстаноўка, а калі мы вяртаемся ў афлайн — жыццё іншае.

**По матэрыялах раённых газет.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**



### У тэму

**У гэтыя выхадныя, 5-6 верасня ў Мінскай вобласці адбудзецца эстафета «За Беларусь! За мір! За дружбу! За Прэзідэнта!»**

Эстафета пачнецца ў суботу на мемарыяльным комплексе «Курган Славы» а дзявятай гадзіне раніцы. Ва ўрачыстым адкрыцці мерапрыемства прымуць удзел кіраўніцтва вобласці, прадстаўнікі грамадскасці, моладзь.

Пасля гэтага ад «Кургана Славы» стартуюць дваццаць машын з жыхарамі Смалявіцкага раёна. Яны накіруюцца ў Жодзіна, дзе перададуць эстафету і дзяржаўны сцяг мясцовым аўтамабілістам, тыя, у сваю чаргу, — Барысаўскаму раёну.

Усяго ў першы дзень у эстафеце прымуць удзел адзінаццаць раёнаў. Завершыцца мерапрыемства ў Капылі а 19-й гадзіне вечара.

Адтуль жа ў нядзелю аўтапрабег прадоўжыцца, пачатак яго ў 9.00. Плануецца наведванне знакавага для Беларусі месца — мемарыяльнага комплексу «Хатынь».

Мяркуецца, што ў эстафеце паўдзельнічаюць больш як 600 машын. Усяго яны пройдуць 1200 кіламетраў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# «Святло стваральнага пісьменства...»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

***— І магіляўчанам ёсць чым ганарыцца...***

— Сапраўды. Прыгадаем паэтаў, празаікаў, якія дзесяцігоддзямі фарміравалі творчае аблічча гэтай унікальнай старонкі. Мяркуйце самі. Народны паэт Беларусі Аркадзь Куляшоў, чые радкі пра лёс бацькі Міная, чыю баладу «Камсамольскі білет» чытаюць пакаленні беларусаў. Працуючы на тэлебачанні, я не раз слухаў удзельнікаў конкурсу «Жывая класіка». Дык калі дзеткі чыталі нешта з Куляшова — было вельмі шчымліва. Народны пісьменнік Беларусі Іван Чыгрынаў. У яго раманах «Плач перапёлкі», «Апраўданне крыві», а шмат хто, відаць, і фільмы, знятыя па гэтых кнігах, глядзеў, столькі болю і народнага плачу, што іх не лішнім было б прачытаць сёлетнім мітынгоўшчыкам і разбуральнікам Беларусі. Любаванне хараством роднага слова вылучае яшчэ адну акалічнасць, а можа, і выключна сёлетнюю адметнасць Свята пісьменства. І мясцовыя арганізатары Дня беларускага пісьменства, і ўсе мы, хто далучаны да яго праграмы, думалі пра сацыялізацыю свята, пра тое, каб спалучыць высокае і зямное. Таму ж і многіх мясцовых пісьменнікаў згадваем, таму і моладзь пастараліся ўключыць у квэст-гульню «Скарбы князя Гальшанскага», прысвечаную жыццю і творчасці Уладзіміра Караткевіча. Мы стараліся так сфарміраваць праграму, так тэматычна вылучыць многія абсягі, каб усім было цікава. І самім пісьменнікам, і простаму чалавеку, які адарваўся ад важкіх восеньскіх клопатаў і ў выніку зразумеў бы, што не дарэмна патраціў час. І сваімі роднымі Бялынічамі ў новых, скажам так, строях палюбаваўся, і насыціўся добрымі, светлымі ўражаннямі.



Фота БелТА.

***— Ігар Уладзіміравіч, паколькі вы згадалі аўтара рамана «Каласы пад сярпом тваім», то хацеў бы запытацца, як у юбілейны год, у 90-годдзе з дня нараджэння, будзе заўважаны ў Бялынічах класік беларускай нацыянальнай літаратуры?***

— Я назваў бы Караткевіча не проста нацыянальным класікам, а пісьменнікам сусветнага маштабу, сусветнага гучання, літаратарам, чые творы асабліва дарагія славянскім прасторам, добра знаёмыя чытачам і Беларусі, і Расіі, і ўсіх краін-суседзяў, ды і многіх іншых далёкіх і не такіх далёкіх ад нас краін. Працуючы зусім нядаўна на тэлебачанні, я з калегамі выпусціў шэраг дакументальных, мастацка-публіцыстычных фільмаў, у якіх мы пастараліся расказаць пра многіх пісьменнікаў, імёны якіх на слыху ў многіх і многіх людзей. Зрабілі фільмы пра ластаўку з майго роднага Палесся Яўгенію Янішчыц. Зрабілі і фільм пра Караткевіча. Столькі чуў хвалюючых слоў ад людзей, якія следам за тэлевізійным знаёмствам з выкладаннем лёсу аўтара «Каласоў...», «Дзікага палявання караля Стаха» пабеглі ў кнігарні і бібліятэкі, каб хутчэй адкрыць кнігі пісьменніка.

***— І, несумненна, кнігі Уладзіміра Сямёнавіча з году ў год перавыдаюцца?***

— Прывяду вам і чытачам «Звязды» амаль статыстыку. Толькі за мінулае дзесяцігоддзе ў краіне на беларускай і рускай мовах выйшла амаль 50 (уявіце сабе: 50!) кніг класіка. Агульны тыраж склаў ці не 100 тысяч экзэмпляраў. Падкрэслю: толькі за адно дзесяцігоддзе. Дарэчы, выдавецтва «Мастацкая літаратура» завяршае выданне 25-томнага Збору твораў Уладзіміра Караткевіча.

***— Так што, да 90-годдзя Караткевіча рыхтаваліся...***

— І да 90-годдзя, і да свята ў Бялынічах — таксама. Рыхтаваліся ўсе кніжныя выдавецтвы краіны — і дзяржаўныя, і прыватныя. У нас, дарэчы, зарэгістравана каля 400 суб'ектаў гаспадарання, якія займаюцца выдавецкай дзейнасцю. І штогод у Беларусі выпускаюць каля 10 тысяч назваў кніг.

***— Лічбы ўражваюць.***

— Тут справа не ў лічбах. Хацелася б падкрэсліць, што да Дня беларускага пісьменства мы рыхтуемся загадзя, рыхтуемся цэлы год. Мяркуем, як будзем прэзентаваць, ушаноўваць Яе Вялікасць Кнігу, беларускае мастацкае слова менавіта ў першую нядзелю верасня кожны год. Часам прыходзяць думкі, што мо і не да свята ў такі напружаны час. Але ж свята — гэта люстэрка і сацыяльных памкненняў грамадства, люстэрка дзяржаўнай увагі да беларускага пісьменства, да мовы, культуры, нацыянальнай літаратуры. Таму і ў Бялынічах мы шмат увагі аддаём традыцыям... Вось у гэтым кірунку нам і візуальнае мастацтва паспрыяе. Беларускае тэлеграфнае агенцтва арганізавала фотавыстаўку «Традыцыі суверэннай Беларусі». А летась, дарэчы, пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі БелТА і кнігу з такой назвай выпусціла. Пагартайце яе старонкі — і адкрыеце гэтульки прыгожых здзяйсненняў, што характарызуюць развіццё нашай краіны! А канцэрт закрыцця свята якраз прысвечаны традыцыям.

**«Усе мерапрыемствы, усе дзействы на гэтых пляцоўках ладзяць людзі, нераўнадушныя да друкаванага слова, да мастацкай, публіцыстычнай, асветніцкай кнігі».**

***— Словам, сыходзяцца на свяце пісьменства розныя мастацтвы, розныя кірункі дзейнасці?..***

— Так. Невыпадкова поруч з Міністэрствам інфармацыі арганізатарамі свята выступаюць не толькі мясцовыя ўлады, а яшчэ міністэрствы культуры, адукацыі, спорту і турызму. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў... Усім знаходзіцца клопат, усе гатовы праявіць суладнасць і з кнігай, і з прыгожым пісьменствам увогуле, а галоўнае — паспрыяць таму, каб было цікава магіляўчанам, жыхарам Бялыніч і ваколіц.

***— Ці будуць на свяце замежныя госці, улічваючы няпростую эпідэміялагічную сітуацыю?***

— Па традыцыі, пачынаючы з 2007 года, мы ладзім на Дні беларускага пісьменства міжнародны круглы стол «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго». За ўсю гісторыю гэтага творчага праекта са святам і з нашай краінай пазнаёміліся многія і многія пісьменнікі літаральна з дзясяткаў краін: з Вялікабрытаніі, Казахстана, Узбекістана, Таджыкістана, Сербіі, Чарнагорыі, Манголіі, Кітая, Польшчы, Індыі, Малдовы, Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі... Асаблівае сяброўства склалася з Расіяй. Да нас прыязджалі паэты, празаікі, публіцысты, перакладчыкі, літаратуразнаўцы не толькі з Санкт-Пецярбурга і Масквы, але з Екацярынбурга, Астрахані, Томска, Новасібірска, з Чувашыі, Удмурціі, Татарстана, Башкартастана, Чачэнскай Рэспублікі, Кабардзіна-Балкарыі, Калмыкіі, Марый Эл... Сёлета шмат хто пацвердзіў свой удзел у «бялыніцкім» круглым стале «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго. Слова стваральнае і слова разбуральнае» віртуальна, з дапамогай сучасных электронных тэхналогій. Відавочная цікаўнасць да Беларусі, да спасціжэння беларускага характару мастакамі слова.

***— У назве круглага стала — пра разбуральнасць...***

— Але ж і пра стваральную, пазітыўную ролю мастацкага, публіцыстычнага слова. Насамрэч, не павінна існаваць ніякага разбуральнага слова. Мы завастрылі публіцыстычны характар мяркуемай гаворкі. Слова павінна насіць толькі стваральны характар!.. Пра гэта гаварылася, і калі мы праводзілі з уладыкам Веніямінам у шлях па адрасах праваслаўных святыняў традыцыйную экспедыцыю «Дарога да святыняў», якая, дарэчы, фінішуе ў Бялынічах у час урачыстага адкрыцця Дня беларускага пісьменства.

***— Ігар Уладзіміравіч, разумею, што шмат пра што проста яшчэ не расказалі, прэзентуючы бялыніцкі Дзень беларускага пісьменства...***

— Самы лепшы расповед — жывыя ўражанні. Запрашаю ўсіх чытачоў «Звязды» ў Бялынічы! Усё ўбачыце на свае вочы. Дарэчы, нагадаю, калі хто яшчэ не ведае, што ўрад прыняў рашэнне правесці наступны Дзень беларускага пісьменства ў Капылі, на Міншчыне. Выбар зусім не выпадковы. З Капыльшчынай звязаны імёны такіх легендаў пісьменства, як Кузьма Чорны, чыё 120-годдзе з дня нараджэння мы, між іншым, згадаем і ў Бялынічах, Алесь Адамовіч, аўтар вядомых свету кніг «Хатынская аповесць», «Карнікі», суаўтар надзвычай эмацыянальнай «Блакаднай кнігі», збору аповедаў, пякельных аповедаў сведак драматычных падзей Вялікай Айчыннай вайны «Я з вогненнай вёскі». Наўмысна падкрэсліваю гэта, бо глыбока перакананы, што стваральнае слова павінна весці ўсё наша грамадства да высокіх гуманістычных ідэалаў дабрыні, справядлівасці, мірнага суіснавання. І Дзень беларускага пісьменства як даўняя дзяржаўная традыцыя гэтага руху — добрая пляцоўка для добрых спраў.

**Гутарыў**
**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

# СНЯДАНАК НА «ВЫДАТНА»!

## СНЕДАЦЬ АБО НЕ?

***— Сёння ў многіх сем'ях наогул не прынята снедаць. Дарослыя выпіваюць кубачак кавы на бягу, і дзеці пераймаюць звычку бацькоў не есці да 12-13 гадзін дня. Ды і як можна патрабаваць ад дачкі ці сына снедаць, калі нават дарослым адразу пасля абуджэння есці не хочацца? Дык, можа, няма чаго і агарод гарадзіць? Не хочацца — не еш, сытней паабедаеш?***

— Гэта шкоднае перакананне. Сняданак — адзін з найважнейшых, калі не самы важны прыём ежы за дзень, асабліва для школьніка. Ён забяспечвае арганізм энергіяй на першую і самую актыўную палову дня, пастаўляе неабходныя карысныя рэчывы ўсім органам і сістэмам. Для дзіцяці, якое ідзе на ўрокі ў школе, потым — на факультатывы, потым, дапусцім, на заняткі ў спартыўнай секцыі або мастацкай студыі, сняданак проста неабходны. Бацькі абавязаны паклапаціцца, каб гэты прыём ежы быў не толькі смачны, але і карысны. Не хочацца есці адразу пасля сну? Падніміце дзіця на 10—15 хвілін раней. Паверце, карысці для здароўя будзе больш, чым спаць да апошняга, а потым галодным адпраўляцца ў школу, — сцвярджае **намеснік дырэктара Навукова-практычнага цэнтра па харчаванні Нацыянальнай акадэміі навук Алена МАРГУНОВА.** — Дарослым, дарэчы, таксама важна снедаць. Звычка снедаць зберажэ ад эндакрынных і сардэчных захворванняў, дапаможа пазбегнуць лішняй вагі і захавае зубы здаровымі да глыбокай старасці. Нашы звычкі закладваюцца з дзяцінства. Снедайце самі і прывучыць снедаць сваіх дзяцей.

***— Раніцай гатаваць няма часу. Ці можна абысціся «гатовымі» варыянтамі — скажам, па амерыканскім прынцыпе: малако і шматкі?***

— Салодкія шматкі ў якасці сняданку — няўдалы варыянт. У гатовых сухіх сняданках практычна адсутнічаюць карысныя рэчывы, аднак прысутнічае шмат дадатковага цукру, шмат кілакалорый — 300—400 на 100 г прадукту. Пасля такой ежы ў дзіцяці рэзка ўзрастае ўзровень глюкозы ў крыві, пачынае актыўна выпрацоўвацца інсулін. Праз гадзіну-дзве ўзровень цукру ўпадзе, і дзіця адчуе моцны голад. Штодзённае ўжыванне сухіх гатовых сняданкаў можа прывесці да развіцця атлусцення, справакаваць шэраг захворванняў, такіх як цукровы дыябет ці алергія. Гранулы, якія плаваюць у малацэ, ніколі не заменяць паўнавартаснага сняданку. Паводле даследаванняў, у прадукцыі 85 самых папулярных у свеце марак дзіцячых сухіх сняданкаў утрыманне солі, цукру і тлушчу вышэй за норму. Так што давайце звяртацца да іх толькі тады, калі няма нічога лепшага. Калі складана адмовіцца ад гатовых сухіх сняданкаў, яны могуць прысутнічаць у рацыёне не часцей як два разы ў тыдзень (а лепш — адзін раз за сем дзён). У гэтым выпадку выбірайце шматкі з нізкім утрыманнем цукру і вялікім утрыманнем клятчаткі і харчовых валокнаў. Я не рэкамендавала б на сняданак дзіцяці і любімы «савецкі» варыянт у процівагу «амерыканскаму»: глазураваныя сыркі. У іх таксама шмат цукру, тлушчу і араматызатараў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

## ПРАЧНІСЯ І ЕШ!

***— Правільны сняданак школьніка — што ён павінен уключаць у сябе?***

— Найлепшы варыянт — бялковы сняданак. Формула такая: на кожныя 20 кг вагі дзіцяці павінна прыходзіцца па 100 г белага мяса. Напрыклад, курынай грудкі. Бялкі курынага мяса лёгка пераўтраўляюцца, і арганізму не прыйдзецца марнаваць шмат энергіі на засваенне ежы — лепш няхай дзіця выдаткуе гэтую энергію на засваенне ведаў. Курынае мяса багатае вітамінамі $B_2$, $B_6$, $B_{12}$, якія ўмацоўваюць нервовую сістэму, паляпшаюць памяць, прадухіляюць дэпрэсію і бяссонніцу. Дадайце да курыцы порцыю агародніны і пару бутэрбродаў з сырам. Гэтага дастаткова. Калі сняданак будзе занадта сытны, уся энергія пойдзе ў страўнік, і школьнік на ўроку будзе «спаць». А бялкі дапамагаюць мозгу і памяці працаваць, зараджаюць бадзёрасцю. Толькі не давайце дзіцяці раніцай увесь аб'ём бялкоў за раз — пакіньце палову на другі сняданак.

***— А калі ад мяса раніцай сын або дачка адмовіліся?***

— Нядрэнны альтэрнатывай беламу мясу стане каша. А таксама яйкі, тварог, натуральныя ёгурты. Хачу дадаць некалькі слоў пра кашы. Адна і тая ж каша (дапусцім, грэчка) на сняданак — гэта не найлепшы варыянт. Кашы трэба перыядычна мяняць, бо кожная крупа змяшчае свой набор вітамінаў і мікраэлементаў. Лепш за ўсё выбіраць розныя міксы з 3—5 злакаў. Кашы патрэбны цэльназерневыя, тыя, якія трэба варыць, а не шматкі, што не патрабуюць варкі. У іх значна менш вітамінаў і мікраэлементаў, чым у цэльназерневых кашах. Дадаваць у кашы можна кавалачкі садавіны, ягады і арэхі.

***— Дарослыя раніцай п'юць каву. Што прапанаваць дзіцяці?***

— Кава да 12 гадоў дзецям наогул не рэкамендавана. Гэты напой можа выклікаць тахікардыю. Прыдатны напой для раніцы — не сок, а смузі з садавіны або агародніны. І, вядома, чай: ён павінен быць свежазавараны і, пажадана, зялёны. У чорным ёсць дубільныя рэчывы, якія пагаршаюць працэс страравання.

***— Калі казаць пра сняданак, напэўна, ёсць нейкія асаблівасці ў залежнасці ад узросту школьніка?***

— Усё вышэйсказанае датычыцца школьнікаў любога ўзросту — і малодшых, і старшакласнікаў. Але на працягу 11 гадоў вучобы ў школе ёсць два крытычныя перыяды, калі да рацыёну дзяцей трэба ставіцца асабліва ўважліва. Гэта малодшыя класы, калі ў малых проста неверагодна інтэнсіўны абмен рэчываў плюс нагрузка ў школе. Таму мозгу павінна быць забяспечана максімальная працаздольнасць — значыць, максімум пажыўных рэчываў і вітамінаў. Другі крытычны перыяд — гэта палавое паспяванне, 12—14 гадоў. У гэтыя два перыяды ўсе рэкамендацыі спецыялістаў па харчаванні дзяцей, пра якія я расказваю, для бацькоў абавязковыя. У астатні час іх таксама трэба выконваць, але, магчыма, не так строга.

## ПРАВІЛЫ ПЕРАКУСУ

***— А калі раніцай дзіця ўсё ж такі не паела...***

— Тады да другога ўрока яно моцна прагаладаецца. І пабяжыць у буфет па вугляводы. У гэтым выпадку нават кукурузныя палачкі з малаком у якасці другога сняданку — меншае зло. Калі абодва сняданкі былі паўнавартаснымі, то да абеда есці дзіцяці не трэба. Але калі накарміць школьніка правільна бацькам не ўдалося, то спатрэбяцца перакусы. У якасці перакусу непажаданыя булачкі, шакаладныя батончыкі, пірожныя — крыніцы хуткіх вугляводаў. Вугляводы хутка паступяць у кроў, хутка павысяць утрыманне глюкозы, але і эфект пройдзе хутка. Энергіі такая ежа дасць максімум на адзін урок.

***— Сухафрукты падыходзяць для перакусу школьніка?***

— Сухафрукты вельмі карысныя. Але не ўсё так адназначна. Па-першае, для нармальнага засваення іх трэба добра пераходзіць, што дзеці звычайна рабіць лянуюцца. Па-другое, вітамінаў у іх у параўнанні з зыходным прадуктам мала — у куразе, напрыклад, іх у 10 разоў менш, чым у абрыкосах (праўда, мікраэлементаў і калорый столькі ж). Па-трэцяе, для засваення сухафруктаў абавязкова трэба выпіць вады: яна растварае пажыўныя рэчывы, і яны змогуць усмактацца ў кроў. Па-чацвёртае, сухафрукты не даюць энергію хутка. Засвойвацца яны пачынаюць толькі праз 40—50 хвілін пасля таго, як вы іх з'елі. Дарэчы, хутчэй за ўсё засвойваюцца фінікі.

***— А проста садавіна — гэта добры перакус?***

— Садавіна — гэта не паўнавартасны перакус, а дэсерт. Яна можа толькі дапаўняць прыём ежы. Насычэнне ад садавіны праходзіць у сярэднім праз 30 хвілін. І дзіцяці зноў хочацца есці. А частыя перакусы — прамы шлях да лішняй вагі. Садавіны школьнік павінен спажываць 100—150 г у дзень. Калі ў дзіцяці ёсць лішняя вага, выключыце банан і фінікі.

***— Арэхі — упадабаны прадукт прыхільнікаў здаровага спосабу жыцця. Падыходзяць яны для перакусу школьніку?***

— У арэхах ёсць усё, акрамя вугляводаў: і бялкі, і тлушчы, і лецыцін, вітаміны А і Е, якія ўмацоўваюць імунітэт і палавую сістэму. Арэхі лепш для дзіцяці выбіраць звыклыя: грэцкія, міндаль, фундук. На экзотыку можа быць алергія. І лепш пазбягаць арэхавых міксаў. Правіла здаровага стрававання: адзін дзень — адзін від арэхаў. Арэхі самі па сабе досыць цяжкая ежа, а арэхавая сумесь — гэта стрэс для страўніка. Наогул школьніку дастаткова з'ядаць чатыры арэшкі ў дзень. І яшчэ некалькі слоў пра тое, што лепш піць паміж урокамі. Гэта не сок з тэтрапака: у соках прамысловай вытворчасці можа быць шмат кансервантаў і дадатковага цукру. Піць школьніку на пераменах лепш проста пітную ваду або кампот з сухафруктаў ці свежых ягад.

## ШТО ПАКЛАСЦІ Ў ПАРТФЕЛЬ?

***— Давайце падвядзём вынік: што з ежы сабраць раніцай школьніку ў якасці перакусу?***

— Вось прыклад правільнай «зсабойкі» ў школу:

- Бутэрброд з адварным мясам або з амлетам з гароднінай
- Арэхі аднаго віду (грэцкія, фундук або міндаль) — 4 шт.
- Сухафрукты — 100 г
- Садавіна (груша, яблык, банан і г. д.) — 150 г
- Пітная вада — 1 л

Пра бутэрброд хачу ўдакладніць. Хлеб лепш выбіраць цэльназерневы або з семачкамі, злакамі. Можна падсушыць яго з аднаго боку на сухой патэльні.

Мяса можа быць запечанае (курыца, індычка, трус, цяляціна).

Бутэрброд можа быць і са слабасалёнай чырвонай рыбай (набытай у краме), але гэта — для дзіцяці ва ўзросце ад 12 гадоў і не часцей як адзін раз на тыдзень.

У бутэрброд пакладзіце лісцік салаты, кружочак свежага агурочка, лустачку балгарскага перчыка. Такі сэндвіч разразаем на невялікія кавалкі (дапусцім, трохвугольнікамі), каб дзіцяці прасцей было яго з'есці.

І яшчэ некалькі парад. Выберыце разам са школьнікам прыгожы кантэйнер для «зсабоек» і прыгожую бутэльку для вады. Калі яму падабаецца бутэлька, то ўжо не так важна, што ў ёй проста вада, а не салодкая газіроўка.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Надвор'е

# ДОЖДЖ, АЛЕ ЦЁПЛЫ

### Сіноптыкі абяцаюць «мокрыя» выхадныя, праўда халадней ад гэтага не стане

**А наогул верасень будзе цёплы. Сярэдняя месячная тэмпература паветра чакаецца на 1—1,5 градуса вышэй за сярэднія шматгадовыя значэнні (кліматычная норма складае плюс 11—13 градусаў). Месячная колькасць ападкаў чакаецца ў межах кліматычнай нормы (49—77 мм), паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сонечнае надвор'е чакаецца ў суботу. Гэта таму, што наша краіна будзе ў асноўным знаходзіцца ў вобласці павышанага атмасфернага ціску, толькі днём на заходнія раёны перамесціцца чарговая франтальная сістэма. Таму раніцай і ўдзень пераважна па захадзе краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Уначы і раніцай паблізу вадаёмаў і ў нізкіх месцах будзе згушчацца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 7 да 13 градусаў цяпла, па захадзе — да плюс 15 градусаў. Удзень будзе ад 18 цяпла да плюс 25 градусаў.

У нядзелю чакаецца дажджлівае надвор'е. У гэты дзень захаваецца ўплыў атмасферных франтоў, якія перамяшчаюцца цераз тэрыторыю краіны. Уначы і раніцай на большай частцы нашага рэгіёна, а ўдзень пераважна па паўднёвым усходзе пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы складзе 10—16 градусаў. Удзень будзе ад 16 да 23 градусаў цяпла, а па паўднёвым усходзе — 24—26.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня захаваецца ўплыў атмасферных франтоў, якія будуць перамяшчацца з Заходняй Еўропы. У панядзелак уначы ў асноўным па паўднёвым усходзе, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 7—13 цяпла, удзень будзе ад 16 да 22 цяпла. Па паўднёвым усходзе краіны ў разгар дня тэмпература паветра будзе падымацца да плюс 24—27 градусаў.

❍ Да слова

### ЖНІВЕНЬ БЫЎ СУПЕРГАРАЧЫ

Мінулы месяц быў шчодры на рэкорды. Сярэдняя тэмпература паветра ў жніўні склала плюс 18,6, што вышэй за кліматычную норму на 1,3 градуса.

14.7. В соответствии с главой 18 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор при вручении Призов № 1, № 4, № 5, № 6, № 8 выступает налоговым агентом и обязан удержать сумму подоходного налога из доходов получателя приза. При невозможности удержать исчисленную сумму подоходного налога с дохода Основного Победителя/Резервного Победителя по причине отсутствия ему денежных выплат и (или) отказа плательщика внести причитающиеся суммы подоходного налога с Основного Победителя/Резервного Победителя Организатор обязан в месячный срок со дня выявления указанных фактов направить в налоговый орган по месту жительства плательщика сообщение о возникновении у Основного Победителя/Резервного Победителя объекта налогообложения подоходным налогом.

**15. Название печатного средства массовой информации, в котором будут опубликованы результаты проведения Рекламной игры, а также сроки их опубликования**

15.1. Правила Рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

15.2. Результаты розыгрышей Рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 18 ноября 2020 г.

**16. Порядок предоставления информации по вопросам проведения Рекламной игры**

16.1. Все возможные претензии участников в отношении организации и условий передачи призов должны быть адресованы Организатору Рекламной игры по адресу: 220090, г. Минск, Логойский тракт, д. 37, пом. офисное 18.

16.2. Информацию об условиях участия и проведения Игры можно получить по телефонам: + 375 (29) 398-70-31, +375 (44) 596-01-97 с 10.00 до 17.30.

**17. Заключительные положения**

17.1. Принимая участие в Игре, участники подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями настоящих Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования настоящих Правил и законодательства, вытекающие из участия в Рекламной игре и/или связанные с получением призов.

17.2. Факт участия в Рекламной игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Рекламной игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио и видео интервью и иные материалы о них без уплаты им какого-либо вознаграждения могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением данной Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие рекламные и (или) информационные материалы будут принадлежать Организатору.

17.3. Организатор не вступает в споры между участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.

17.4. Организатор не несет ответственности за качество работы почтовых служб, в частности за недоставку либо несвоевременную доставку почтовой корреспонденции.

17.5. Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с участником в случае недостоверной информации, предоставленной участником.

Свидетельство № 3841 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 24 августа 2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | **ООО «ЛКВР» (УНП 692074939): г. Минск, ул. П. Бровки, д. 3, корп. 2, пом. 429, тел. 8 029 960 44 34, e-mail lkvr.torgi@by** |
| **Продавец** | **Индивидуальный предприниматель Коптик Александр Александрович (УНП 690861383) в лице антикризисного управляющего ЧПУП «Аналитик-центр», тел.: 8 017 284 05 66, 8 017 284 05 67** |
| **Форма, дата, время и место и проведения торгов** | **Открытые торги (аукцион) по продаже движимого имущества 21.09.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. П. Бровки, 3/2, пом. 429** |

**Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним**

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена предмета торгов (без учета НДС), бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | прицеп (специальный сортиментовоз МАЗ 8378, кузов Y3M83781030013393, 2011 года выпуска, бывшее в употреблении) | 4 752,00 |

Начальная цена лота № 1 снижена на 40 % от первоначальной стоимости. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 21.07.2020

| | |
|---|---|
| **Место нахождения предмета торгов** | г. Вилейка |
| **Сроки и порядок приема заявок и зачисления задатка** | Для участия в торгах в срок по 18.09.2020 до 18.00 необходимо: 1. перечислить задаток в размере 10 % от начальной цены предмета торгов на р/с BY09UNBS30122009110000000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, УНП 692074939, получатель – ООО «ЛКВР», назначение платежа: задаток 10 % по лоту № 1 (движимое имущество) индивидуального предпринимателя Коптика Александра Александровича, аукцион 21.09.2020; 2. подать заявление на участие и необходимые документы по адресу: г. Минск, 220041, а/я 10 либо на эл. почту **lkvr.torgi@tut.by. Тел.: (8029) 960-44-34** |
| **Форма, дата, время и место и проведения торгов** | **Открытые торги (аукцион) по продаже дебиторской задолженности 05.10.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. П. Бровки, 3/2, пом. 429** |

**Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним**

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена предмета торгов (без учета НДС), бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | - дебиторская задолженность ООО «Анфайстрой», УНП 191626949 в размере 6 070,00 бел. руб. | 6070,00 |
| 2 | -дебиторская задолженность ОАО «Залужье», УНП 600028774 в размере 2 885,38 бел. руб. | 2 885,38 |
| 3 | - дебиторская задолженность ЧПУП «Древайсбел», УНП 692094202 в размере 1 782,40 бел. руб. | 1 782,40 |
| 4 | - дебиторская задолженность ОАО «Положевичи», УНП 600028774 в размере 1 292,54 бел. руб. | 1 292,54 |
| 5 | - дебиторская задолженность ООО «СельХозПалет», УНП 600028774 в размере 3 865,60 бел. руб. | 3 865,60 |

| | |
|---|---|
| **Место нахождения предмета торгов** | г. Минск, ул. П. Бровки, 3/2, пом. 429 |
| **Сроки и порядок приема заявок и зачисления задатка** | Для участия в торгах в срок по 02.10.2020 до 18.00 необходимо: 1. перечислить задаток в размере 10 % от начальной цены предмета торгов на р/с BY09UNBS30122009110000000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, УНП 692074939, получатель ООО «ЛКВР», назначение платежа: задаток 10 % по лоту № ___ (дебиторская задолженность) индивидуального предпринимателя Коптика Александра Александровича, аукцион 05.10.2020; 2. подать заявление на участие и необходимые документы по адресу: г. Минск, 220041, а/я 10 либо на эл. почту **lkvr.torgi@tut.by. Тел.: (8029) 960-44-34** |
| **Порядок проведения торгов** | Шаг торгов – 5 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за один день до даты проведения. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 % от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона. Подробнее по телефонам: 8 029 960 44 34, 8 (017) 360-14-79 |
| **Порядок заключения договора и уплаты цены предмета торгов победителем торгов** | Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 15 календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов |

## ТЕХНОБАНК

Открытое акционерное общество
220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44

Открытое акционерное общество «Технобанк» настоящим уведомляет акционеров о принятии внеочередным Общим Собранием акционеров ОАО «Технобанк» 27.08.2020, протокол № 8, решений о крупных сделках, о внесении изменений в Устав ОАО «Технобанк», о праве акционеров требовать выкупа акций в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь. Для реализации своего права требовать выкупа акций акционеру необходимо представить в письменном виде в ОАО «Технобанк» по адресу: 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44 соответствующее заявление произвольной формы на имя Председателя Правления ОАО «Технобанк» в течение 30 дней со дня проведения Общего Собрания акционеров, на котором были приняты решения, повлекшие возникновение права требовать выкупа акций (27.08.2020). ОАО «Технобанк» по результатам рассмотрения поданных заявлений с требованиями о выкупе акций в течение 70 дней с даты поступления заявления в банк удовлетворяет требования акционеров либо в течение 30 дней сообщает акционерам об отказе в удовлетворении требований акционеров.

При необходимости получения дополнительной информации обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу: 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44 в любое удобное время с 11.00 до 15.00 (кроме выходных и праздничных дней), с предъявлением документов, удостоверяющих (подтверждающих) личность и полномочия.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 11 от 03.05.2019, УНП 100706562

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Белслучь» (продавец) проводит открытый аукцион**

**ПО ПРОДАЖЕ ОДНИМ ЛОТОМ ДОМА МЕХАНИЗАТОРА**
**общей площадью 34,4 кв. м с инв. № 644/С-57253**
**И МАСТЕРСКОЙ**
**общей площадью 682,3 кв. м с инв. № 644/С-57252, расположенных на земельном участке с кадастровым номером 625080800001000008 (право постоянного пользования) площадью 0,4197 га по адресу: Минская область, Солигорский район, Долговский с/с, 2, район д. Желтый Брод.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **76 320,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **7 632,00** бел. руб.).

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: ограничение прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, пл. 0,0019 га; земельные участки, расположенные в придорожных полосах автомобильных дорог, пл. 0,4197 га.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **12.10.2020** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.10.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.**

УНП 600071222

## ОАО «КЛИМОВИЧСКИЙ ЛИКЕРО-ВОДОЧНЫЙ ЗАВОД»

**сообщает, что 23.09.2020 года**
**СОСТОЯТСЯ ЭЛЕКТРОННЫЕ ТОРГИ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА:**
**бутылка из бесцветного стекла (1,75 л),**
расположенная по адресу: Могилевская область, г. Климовичи,
**и оборудования,**
расположенного по адресу: Могилевская обл., г. Климовичи, ул. Волкова, 10;
Могилевская область, Быховский район, аг. Грудиновка, ул. Тихая, д. 7;
Могилевская область, Хотимский район, аг. Забелышин;
Могилевская область, Кричевский район, аг. Красная Буда;
Могилевская область, Костюковичский район, д. Пасека.

Информацию об условиях проведения электронных торгов можно уточнить на сайтах **torgi.gov.by** и **bankrot.gov.by.**

УНП 700103211

**УП «Белконфискат» объявляет о проведении электронных торгов 23.09.2020 г. по продаже имущества Дятковского И.А.**
**легковой автомобиль «Пежо 207», 2007 г. в.,**
**начальной стоимостью 4 200 рублей.**
На сайте **belkonfiskat.by** размещена информация о торгах.
Справки по тел.: 8 (017) 3639489, 8 (029) 7790809.

УНН 190431606



# ПРАДЧУВАННЕ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ

## Што чакае Ліван?

**Роўна месяц мінуў пасля выбуху, які прагрымеў у Бейруце ўвечары 4 жніўня. Яго ахвярамі сталі звыш 170 чалавек, пацярпелых — каля шасці тысяч. Паводле ацэнак спецыялістаў Шэфілдскага ўніверсітэта ў Вялікабрытаніі, магутнасць выбуху адпавядае адной дзясятай магутнасці атамнай бомбы, скінутай на японскі горад Хірасіма ў канцы Другой сусветнай вайны. Па словах экспертаў, гэта «безумоўна адзін з наймагутнейшых няядзерных выбухаў у гісторыі чалавецтва». Бейрут ляжыць у руінах, адрэзаны ад знешняга свету (заблакіраваныя марскія зносіны). Там, дзе быў порт, гандлёвы раён, жылыя дамы, цяпер велічэзная жудасная пустка. Што чакае шматпакутны Ліван?**

### СТАЎКА НА... ГАСТАРБАЙТАРАЎ

Ліванская эканоміка доўгі час лічылася ўзорам для большасці суседзяў. Нездарма гэтую краіну раней нярэдка называлі «блізкаўсходняй Швейцарыяй». Хоць у 1975—1990 гадах Ліван ахапіла жорсткая грамадзянская вайна (якая, між іншым, лічыцца адным з самых крывавых лакальных канфліктаў другой паловы XX стагоддзя), пасля прымірэння дзяржава даволі хутка ачуняла. І пачаўся небывалы эканамічны бум: рост на мяжы стагоддзяў часам ушчыльную набліжаўся да двухзначных паказчыкаў. У цэлым да сярэдзіны 2010-х Ліван стаў найбольш развітой краінай сярод усіх арабскіх дзяржаў, калі выключыць нафтавыя манархіі Персідскага заліва. У 2018 годзе ВУП на душу насельніцтва складаў там звыш 9,3 тысячы долараў.

Гісторыяй поспеху Ліван шмат у чым абавязаны сваёй сацыяльнай структуры. У адрозненне ад іншых арабскіх краін прадстаўнікі разнастайных хрысціянскіх канфесій у краіне складаюць не сціплую меншасць, а амаль палову насельніцтва. Доўгі час менавіта гэтыя абшчыны выступалі асноўным драйверам эканамічнага росту.

Яшчэ ў перыяд валадарства Атаманскай імперыі ліванцы-хрысціяне масава эмігравалі ў ЗША, Лацінскую Амерыку і Еўропу, утварыўшы там згуртаваную і вельмі паспяховую ў бізнесе дыяспару. Частка вярнулася дадому, яны прывезлі вялікія грошы і новыя кампетэнцыі, іншая — актыўна інвеставала ў эканоміку гістарычнай радзімы.

Кваліфікаваныя ліванскія работнікі працуюць у Саудаўскай Аравіі, ААЭ, Катары і іншых нафтавых дзяржавах. Іх уплыў на эканоміку Лівана быў велізарны. Аб'ём перaводаў эмігрантаў адзін час складаў чвэрць ВУП — удвая больш за ўсе прамыя замежныя інвестыцыі.

Такога магутнага рэзерву краіне хапіла надоўга. Аднак у 2010-я гады эканамічны рост стаў рэзка запавольвацца. Тут сваю ролю адыграла адразу некалькі фактараў. Па-першае, пасля крызісу 2008-га інвестыцыі сталі менш інтэнсіўныя, што было звязана з нежаданнем браць на сябе рызыкі ў нестабільнай абстаноўцы. Па-другое, канкрэтна для Лівана сітуацыя ўскладнілася грамадзянскай вайной у суседняй Сірыі. Укладвацца ў дзяржаву, якая па сутнасці знаходзіцца на лініі фронту, ахвотных аказалася няшмат.

### ПЯРЭСТЫ СКЛАД

Ліван — адзіная дзяржава ў свеце, дзе дасюль улада афіцыйна фарміруецца па рэлігійным прынцыпе. Па канстытуцыі прэзідэнтам можа быць толькі хрысціянін-мараніт, прэм'ер-міністрам — мусульманін-суніт, а спікерам парламента — мусульманін-шыіт. У парламенце месцы павінны быць раўнамерна размеркаваны паміж хрысціянамі і мусульманамі. Такі пярэсты рэлігійны склад насельніцтва, асабліва ў блізкаўсходняй краіне, неаднойчы прыводзіў да ўнутраных канфліктаў, у тым ліку да грамадзянскай вайны 1975—1990 гадоў.

У апошнія некалькі гадоў Ліван сутыкнуўся з шэрагам эканамічных і палітычных праблем. Паступова павялічваўся ўплыў «Хезбала» — шыіцкай ваенізаванай групоўкі, якая падтрымліваецца Тэгеранам. Гэта прывяло да астуджэння адносін з галоўным крэдыторам Лівана — Саудаўскай Аравіяй, дзяржаўнай рэлігіяй якой з'яўляецца іслам суніцкага кірунку. У 2016-м саўдзіты яшчэ мацней зрэзалі фінансавую дапамогу Лівану, пасля таго як адразу шэсць прадстаўнікоў «Хезбала» атрымалі міністэрскія партфелі. Урад аказаўся паралізаваны, крэдыты, якія даюцца краінамі Персідскага заліва, перасталі паступаць у краіну, у якой раслі беспрацоўе і інфляцыя. На эканамічнай сітуацыі ў Ліване сур'ёзна адбілася праблема сірыйскіх бежанцаў, больш за мільён якіх асела ў краіне. Яны сталіся непад'ёмнай ношай для ліванскай эканомікі.

Да канца 2018-га дзяржаўны доўг Лівана дасягнуў $90 млрд., што, па ацэнцы Сусветнага банка, складае 151 % ад ВУП краіны. Урад Лівана паспрабаваў атрымаць яшчэ больш пазык, увёў новы падатак на выкарыстанне месенджараў і павысіў старыя — на бензін і тытунь. Вынікам гэтага сталі маштабныя пратэсты. Пратэстоўцы патрабавалі эфектыўнай барацьбы з карупцыяй і адстаўкі ўрада. У выніку пратэстаў прэм'ер-міністр Саад Харыры сышоў у адстаўку, аднак гэта мала дапамагло.



У сакавіку 2020-га Бейрут аб'явіў дэфолт. Як сказала vedomosti.ru старшы навуковы супрацоўнік цэнтра арабскіх і ісламскіх даследаванняў Інстытута ўсходазнаўства РАН Святлана Бабянкова, яго прычынай стала фінансавая піраміда дзяржаўных каштоўных папер, створаная ўладамі. Паводле яе слоў, для прыцягнення замежных інвестараў Цэнтральны банк Лівана прапаноўваў па даўгавых паперах працэнты, якія прыкметна перавышаюць сярэднесусветныя паказчыкі. Камерцыйныя банкі Лівана працягвалі інвеставаць у дзяржаўны доўг, таму што інвестыцыйна прывабныя сферы ў эканоміцы краіны практычна адсутнічалі. Даход па паперах старых інвестараў плаціўся за кошт грашовых сродкаў інвестараў новых. Такім чынам, заключае Бабянкова, у Ліване на дзяржаўным узроўні дзейнічала так званая «схема Понца» — фінансавая піраміда. Вынікам гэтага стаў зварот да МВФ і Сусветнага банка па фінансавую дапамогу. Як падкрэслівае эксперт, крэдыты ад міжнародных фінансавых арганізацый накладваюць на Ліван палітычныя абавязацельствы — у тым ліку па правядзенні рэформаў, вельмі непапулярных сярод насельніцтва. Менавіта ў гэты няпросты для краіны час адбыліся яшчэ два моцныя ўдары — пандэмія COVID-19 і выбух у Бейруце.

Па словах Святланы Бабянковай, паводле асобных ацэнак, Лівану толькі на барацьбу са старымі эканамічнымі праблемамі патрабуецца каля $93 млрд. «Лівану зараз цяжка, вельмі цяжка, наступствы проста катастрафічныя. Саудаўская Аравія можа даць грашовыя сродкі на аднаўленне Бейрута пасля выбуху, калі гэта была тэхнагенная катастрофа. Саудаўскай Аравіі досыць выгадна замацавацца ў краінах Леванта. Канчатковыя мэты саудаўскага кіраўніцтва будуць вядомыя толькі па факце іх дзеянняў», — выказалася эксперт.



### БЕЗ ХЛЕБА І СВЯТЛА

Яшчэ да трагедыі ў порце ліванскія ўлады ўвялі рэжым «грамадзянскай мабілізацыі» з-за каранавіруса. У краіне і так ужо некалькі месяцаў практычна адсутнічала электрычнасць, адчуваўся паліўны крызіс, міністэрства аховы здароўя з пачатку лета біла трывогу ў сувязі з дэфіцытам медыкаментаў і матэрыялаў у шпіталях.

Выбух знішчыў сотні прыватных электрагенератараў, якія былі альтэрнатыўнай крыніцай энергіі. Ліванскую сталіцу ахінула непраглядная цемра, перасталі працаваць і помпы водазабеспячэння, пачаліся перабоі з інтэрнэтам і сотавай сувяззю, агульны калапс пагаршаўся спякотай і вільготнасцю.

Кіраўніцтва ААН папярэдзіла, што ў Ліване можа пачацца сур'ёзны гуманітарны крызіс. Краіна і без таго перажывала сур'ёзны эканамічны спад, але цяпер сітуацыя можа стаць катастрафічнай. Як адзначаецца ў заяве Сусветнай харчовай праграмы (WFP — структура ААН), наступствы надзвычайнага здарэння адаб'юцца на пастаўках у краіну прадуктаў, што прывядзе да росту цэн. Выбух у Бейруце цалкам разбурыў адзінае ў Ліване збожжасховішча, якое знаходзілася ў порце, а планы будаўніцтва іншага ангара былі адкладзеныя некалькі гадоў таму з-за адсутнасці фінансавання, паведаміла Reuters. Паводле інфармацыі WFP, Ліван імпартуе 85 працэнтаў прадуктаў харчавання.

Да выбуху патрэбу ў дапамозе мелі 75 працэнтаў ліванцаў, трэць жыхароў краіны не мелі работы, каля мільёна чалавек жылі за рысай беднасці. Як аказалася, абвастрэнне палітычнага, эканамічнага, фінансавага і эпідэміялагічнага крызісу стала не канчатковым спісам ліванскіх бед. На гэтым фоне эксперты прагназуюць катастрафічныя наступствы для сітуацыі ў краіне, і без таго адной з самых бедных на Блізкім Усходзе.

### СУМНЫ ЮБІЛЕЙ

Днямі Ліван адзначыў 100-гадовы юбілей. Пасля распаду Атаманскай імперыі ў выніку Першай сусветнай вайны ён быў абвешчаны асобнай дзяржавай, тут жа перададзены пад кіраванне Францыі па мандаце Лігі Нацый, а рэальную незалежнасць здабыў у 1943-м. У сувязі з гэтым у Бейрут прыбыў кіраўнік колішняй кіруючай дзяржавы Эмануэль Макрон. Дарэчы, гэта ўжо другі яго візіт у гэтую краіну пасля выбуху.

Прэзідэнт Лівана Мішэль Аун за некалькі гадзін да пачатку візіту Макрона прызначыў новым прэм'ер-міністрам краіны Мустафу Адзіба, перш малавядомага 48-гадовага дыпламата, які з 2013-га працаваў паслом у Берліне. Назіральнікі разглядаюць новага прэм'ера як кампрамісную фігуру. Ліванскія палітыкі імкнуцца прадэманстраваць сусветнай супольнасці здольнасць дамаўляцца адзін з адным і прымаць рашэнні, піша New York Times. Ранейшы ўрад на чале з Хасанам Дзіябам праз тыдзень пасля выбуху сышоў у адстаўку.

Гонка за аднаўленне порта Бейрута, канкурэнцыя ў гуманітарных пастаўках, а таксама бітва за тое, хто выцягне эканоміку краіны з ямы, могуць прывесці да ўзыходжання новых глабальных гульцоў на Блізкім Усходзе і ва Усходнім Міжземнамор'і. Ліван рухаецца да таго, каб стаць галоўным ачагом нестабільнасці на Блізкім Усходзе. Нават Ірак, нягледзячы на пастаянныя пратэсты і рэгулярныя аперацыі арміі па пошуку тэрарыстычных ячэек, выглядае пакуль больш стабільным. Калі ў Ліване на пратэснай хвалі сапраўды разваліцца апарат цэнтральнай улады, з'явяцца рэальныя ўмовы для міжнароднага ваеннага ўмяшання. Зрэшты, падобнае ўжо адбывалася падчас грамадзянскай вайны 1975—1990 гадоў. На думку экспертаў, крах Лівана непазбежна выкліча эфект ударнай хвалі ва ўсім рэгіёне. З усімі катастрафічнымі наступствамі.

**Захар БУРАК.**




## НЕ ЛЕЗЬ, ЖАБА, ТУДЫ, ДЗЕ КОНЕЙ КУЮЦЬ

Чым даўжэй жывеш на зямлі, тым часцей успамінаеш мінулае — дзяцінства, юнацтва, шчаслівую маладосць. У ёй не было ні камп'ютараў, ні гаджэтаў, ні смартфонаў — нічога (апроч работы), што трымала б у хаце, таму прыгод мы шукалі на вуліцы.

Памятаю, летнім сонечным днём мы з сяброўкай Маруськай пайшлі на рэчку — хацелі пазагараць. Але ж спачатку, як водзіцца, залезлі ў ваду, пакупаліся, на процілеглым беразе згледзелі некалькі знаёмых машын: яны падвозілі гравій для будаўніцтва дарогі. Відаць, кіроўцы стаміліся — захацелі адпачыць. Можа, нават гэтак жа моцна, як я... пракаціцца на машыне... Ды каб яшчэ і за рулём...

— Маруся, — падбіваю сяброўку, — а давай падыдзем да Сені? Ён з маім братам знаёмы, у нас у хаце быў.... Можа, дасць мне на машыне праехаць?

*— А хіба ты ўмееш?*

*— А што там умець? Ключ павярну, на газ націсну, і панеслася...*

*— Думаеш, Сеня дазволіць? — засумнявалася сяброўка.*

*— Ён такі цяльпук... Мы яго ўгаворым.*

Поўныя рашучасці, мы перабраліся цераз рэчку, падышлі да Сені — сталі клянчыць ключы ад машыны, каб хоць крышачку праехаць. Хлопец спярша адбіваўся, потым аднекваўся, але ж мы яго так малілі...

І вось ключы ў мяне! Шчаслівыя, мы ўскокваем на падножкі грузавіка, я саджуся на месца кіроўцы, паварочваю ключ. Машына (ура-а-а!) кранаецца з месца, едзе ў бок дарогі.

Пад'ём там досыць круты... На ім (сам бог пашкадаваў!) мы ледзь не куляемся, але ж выязджаем на прасёлак.

І каб жа там спыніцца, дык не — далей нячысцік «пагнаў», на вясковую вуліцу. Куры там, бачу, урассыпную, людзі — ледзь не на платы... Мы едзем... І ўжо за ваколіцай.

Там, каб развярнуцца, збочыла з дарогі (добра, што па роўным...), думаю, куды ж мне зараз руліць? А тут яшчэ і Маруська за рукі хапае: «Уцякайма! Ззаду Сеня бяжыць!»

Той у поце і гневе быў ну вельмі страшны! Аднак машыну я ўсё ж спыніла, услед за Маруськай сіганула ў кузаў, і ўжо адтуль мы сталі прасіць прабачэння.

Чуў нас Сеня ці не чуў, сказаць не бяруся. Шчодра абклаўшы мацюкамі, ён выпусціў нас кіламетраў за пяць ад вёскі.

Дамоў мы дабіраліся пехам — знерваваныя, абазваныя, спужаныя, з разуменнем сваёй легкадумнасці і старога залатога правіла: не лезь, жаба, туды, дзе коней куюць.

...Вось такая была прыгода, якая, зазначу, не адбіла ў мяне жадання вадзіць машыну: сорак гадоў ужо за рулём, прычым — без ніводнага спагнання за парушэнне правілаў дарожнага руху.

**Н. Сашына,**
*г. Магілёў.*

## ПРЫГАЖОСЦЬ ПРЫГЛЯДЗІЦЦА, ДАБРЫНЯ — ПРЫГАДЗІЦЦА

З кім павядзешся, ад таго і набярэшся. Гэта — праўда, але ж...

Вось вам прыклад: у вёсцы па суседстве жылі два Міхаілы. Адзін — гультай і выпівоха, якіх пашукаць яшчэ, а другі — якраз наадварот — працавіты, спакойны, спагадлівы...

Такія людзі ўсюды патрэбны: і на гэтым свеце, і... на тым: памёр другі Міхаіл, можна сказаць, раптоўна: сэрца прыхапіла. У бальніцу завезці яшчэ паспелі, а вось уратаваць — не.

Вестка пра гэта маланкай абляцела акругу. Людзі вельмі шкадавалі нябожчыка, успаміналі дабро, што ён зрабіў. А назаўтра — з вянкамі, з жывымі і штучнымі кветкамі — сталі сыходзіцца да яго сялібы, каб адвітацца, каб у горы падтрымаць сям'ю.

Але ж, як аказалася, паспяшаліся вяскоўцы: не прывезлі яшчэ нябожчыка, няма яго ў хаце. Значыць, і заходзіць туды не варта: трэба пачакаць.

Народ (збольшага жанчыны) сабраўся каля хаты, стаў гаманіць ды... замярзаць. Жонка іншага Міхаіла, згледзеўшы гэта, паклікала ўсіх да сябе.

Людзі з ахвотай згадзіліся: зайшлі ў пакой, селі хто дзе змог, паставілі свае вянкі ды кошыкі з кветкамі, зноў загаварылі пра нябожчыка. Адна кабета дык нават галасіць па ім стала, казаць: «Божа ж мой божа, што ж ты нарабіў? Забраў ад нас Міхаіла... А яму б яшчэ жыць і жыць! Такі дабрак! Такі чалавеча! Ён жа мухі не пакрыўдзіў!» Ён жа ўсім дапамагаў! А зараз, бабачкі, да каго мы пойдзем? Хто яго ўдаве дапаможа?

Заўсёды п'яны гаспадар, які нават не чуў яшчэ пра смерць суседа, у той момант прачнуўся, з каморкі ўсунуў нос у прыадчыненыя дзверы залы, убачыў, што там людзі, што ля сцен вянкі, нават надпісы на чорных стужках згледзеў: «Дарагому Міхаілу»...

Як агнём яго, беднага, апаліла: значыцца, памёр!? У неба душа ўзнялася, і ўжо адтуль сваю хату бачыць?

Здранцвеў ад такой здагадкі!

А галасільшчыца, заўважыўшы гэта, яшчэ і «бензіну» ў агонь падліла, сказала: «Згарэў чалавеча! Без пары згарэў — ад гарэлкі! Каб жа не яна, праклятая, гадоў сто пражыў бы!»

На гэтых словах Міхаіла з усіх бакоў абступілі чэрці і пацягнулі да катла з кіпячай смалой: пачалася белая гарачка.

Не на жарт спужаныя вяскоўцы кінуліся з хаты, гаспадыня выклікала «хуткую».

...Апрытомнеў Міхаіл на бальнічным ложку: хоць памалу, але ж стаў прыпамінаць, што з чаго пачалося, як ён сюды трапіў? Узнавіць падзеі дапамагала і жонка: не верыла яна, што калі-небудзь муж возьмецца за розум, але ўсё ж шкадавала — прыехала яго праведаць.

...Хто ведае, можа, і таму здарыўся цуд: Міхась узяў сябе ў рукі, пралячыўся ў нарколага і назаўсёды завязаў з алкаголем. Так што людзі нават праз гады з удзячнасцю ўспаміналі, як адзін Міхась — самы спагадны чалавек у вёсцы — нават пасля смерці сваёй выцягнуў суседа з алкагольнай багны.

**Ф. А.**
*г. Паставы.*

## ДУРНЫЯ ЖАРТЫ ПЛАЧУ ВАРТЫ

...Жывучы між людзей, чаго толькі не пачуеш! Я вось аднойчы стаў чацвёртым у кампаніі Дыпламата (назавём гэтага чалавека так, бо ён некалі працаваў у нашым Міністэрстве замежных спраў), Марака (былога матроса гандлёвага флоту) і Гаспадара, бо гэта на ягонай дачы мы сядзелі «за чаркай чаю» і размаўлялі, здаецца, пра ўсё. Прычым адна з тэм аказалася ну якраз як для звяздоўскага «правада».

А пачалося ўсё з таго, што Гаспадар пахваліўся любімым унукам, студэнтам, які з'ездзіў на практыку ў Англію і адтуль усёй радні прывёз падарункі: бабулі, у прыватнасці, электрапрас, прычым такі наварочаны, што яна і разгубілася: «Як ім прасаваць?» Тады ўнук з англійскай на беларускую — уголас і па пунктах — пераклаў інструкцыю, паказваў, як карыстацца гэтым «агрэгатам». «Ведаеце, што мяне ўразіла? — спытаў у нас заклапочаны дзед, і тут сам жа адказаў. — Забарона прасаваць адзенне на целе... Як быццам нехта да такога можа дадумацца?»

«Мы, беларусы, — наўрад ці, — уступіў у размову Дыпламат. — А вось на захадзе... Адна жанчына там, выкупаўшы ката, вырашыла трохі абсушыць яго. Здагадайцеся, дзе... У мікрахвалёўцы.

Не дзіва, што гэткай сушкі кот не вытрымаў.

Думаеце, гаспадыня яго проста аплакала? Не. За справу ўзяліся яе адвакаты. І выйгралі істотную кампенсацыю — яшчэ і за маральны ўрон... А ўсё таму, што вытворцы ў інструкцыі да мікрахвалёўкі не пазначылі , што сушыць жывёлак там нельга.

І гэта ж не самая памятная судовая справа, — працягваў Дыпламат. — Самая была, відаць, паміж вядомым «Макдональдсам» і жанчынай, якая мела неасцярожнасць перакуліць на сябе кубачак з гарачай кавай. Трохі апёкшыся, яна таксама звярнулася ў суд і таксама выйграла проста шалёныя грошы, пасля чаго на ўсіх кубачках, у якіх падаваліся гарачыя напоі, з'явіўся засцерагальны надпіс: асцярожна, маўляў...

«Нашага чалавека гэта заўвага наўрад ці спыніць, — засумняваўся тады Марак. — Вы ж помніце анекдот: француз з моста кінецца ў ваду за жанчынай, амерыканец — услед за грашыма, а славянін — калі ўбачыць надпіс «З моста скакаць забаронена»... Я па сабе гэта ведаю — сведкам быў.

Прышвартаваліся, мы, значыць, у адным з партоў Канады. А там, як і ў іншых падобных гарадах, крамак, як сабак! І тавараў — на розны густ... У нас тады калькулятараў у вочы не бачылі, а там — бяры — не хачу...

Адзін з нашых матросаў купіў, вярнуўся на судна, усім паказаў. Вольныя ад вахты матросы таксама кінуліся па такія прыборы. А на месцы ўбачылі, што там яшчэ і гадзіннікі файныя ёсць... Хто-ніхто купіў, бо яны ж з секундамерам і нічога не баяцца — ні пылу, ні вады, ні ўдараў...

«Брэшуць нябось?» — засумняваўся нехта з маракоў. Уся каюта ў адказ: «А давайце праверым! Ну цікава ж...»

І сапраўды.

Для пачатку кінулі абнову з вышыні ў метр. Гадзінніку хоць бы хны: ідзе, як ішоў. Скінулі з вышыні ў два метры, у тры, — таксама ідзе. Тады ў кубак з вадой пагрузілі — дасталі... цікае! «А што калі ваду закіпяціць?» — стрэліла некаму.

Гаспадар гадзінніка ну вельмі супраціўляўся — не даваў... Але ж хлопцы адабралі, паклалі ў чайнік, паставілі на пліту, палюбаваліся, як кіпіць... Потым ваду вылілі, гадзіннік дасталі і адразу ўбачылі, што вось гэтай экзекуцыі ён не вытрымаў... Дзеля прыліку яшчэ патрэслі трохі, пагладзілі, але ўсё было марна. «Не прайшоў іспытаў у нашых савецкіх маракоў», — заўважыў нехта...

Назаўтра двое матросаў сталі прасіцца ў капітана на бераг: трэба, маўляў, гадзіннік абмяняць: стаў чамусьці!..

Гаспадар той крамы, дзе яго куплялі, вачам не паверыў (казаў, першы такі выпадак)... Але ж рэч адразу памяняў. Адзінае, у самым канцы «працэдуры» даверліва спытаў: «Скажыце, а што вы з ім рабілі? Ну, перад тым, як спыніўся?» — «Нічога такога... Закіпяцілі».

«Вы думаеце, што гісторыя на гэтым скончылася? — спытаў у нас Марак. — Тады вы памыляецеся. Праз нейкі час мы зноў прышвартаваліся ў тым самым порце. Нехта з нашых маракоў зноў пайшоў у тую самую краму — купіў гадзіннік той самай фірмы.

Разам з ім у каробачцы быў так званы пашпарт, у якім з'явіўся новы пункт: «Не кіпяціць!»

**В. Гаўрыш,**
*г. Чавусы.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***АД ЯЕ Ж ЗАЎСЁДНАЕ:*** *«Пішыце! Конкурс на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю працягваецца».*

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень



**АВЕН.** Тыдзень актыўных дзеянняў, калі ад вас спатрэбіцца прадпрымальнасць і смеласць. Будзьце на вышыні, не давайце нагоды нядобразычліўцам і зайздроснікам. Калі зможаце заняць прынцыповую пазіцыю, то вашы задумы ажыццявяцца. Зможаце паспець многае, практычна ўсё будзе атрымлівацца. У канцы тыдня магчымыя асобныя напружаныя моманты на рабоце і ў асабістым жыцці. Не прымайце пакуль ніякіх рашэнняў, паназірайце за развіццём падзей.



**ЦЯЛЕЦ.** Добры час для пошуку новых сяброў і ўладкавання асабістага жыцця. Зарэгіструйцеся на сайце знаёмстваў, актыўнічайце ў інтэрнэце. Гэта пашырыць вашы гарызонты. Работа зойме нямала часу, але не забывайцеся пра адпачынак. Дзецям неабходна ўвага, ні ў якім разе не адмаўляйце ў ёй, якімі б занятымі вы ні былі. Дапамажыце ім адаптавацца да школы.



**БЛІЗНЯТЫ.** Вас чакае поспех і нямала цікавых творчых праектаў і дзелавых прапаноў. Сам лёс дапаможа ў дасягненні пастаўленай мэты, але яна павінна быць рэальнай. Не чапляйцеся за сваё мінулае, лепш шукайце новае прымяненне сваім здольнасцям. У вас без цяжкасці атрымаецца яркімі фарбамі намаляваць карціну сваёй найбліжэйшай будучыні. У выхадныя разам з сям'ёй выберыцеся на шпацыр або з'ездзіце ў лес, там якраз грыбны сезон.



**РАК.** Зможаце ўсур'ёз заняцца эканамічнымі і кар'ернымі пытаннямі. Калі да гэтага ў вас былі праблемы са здароўем, то цяпер сітуацыя палепшыцца. Усе балячкі пройдуць без следу. Можаце стаць увасабленнем таварыскасці і абаяння. У другой палове тыдня неабходна, каб вас заўважылі і падтрымалі тыя, ад каго вы маглі б атрымаць дапамогу. Не саромейцеся пры выпадку карэктна падкрэсліць сваю незаменнасць на рабоце.



**ЛЕЎ.** Вакол вас нямала спакус. Але зоркі раяць шанаваць тое, што ўжо ёсць. У сярэдзіне тыдня з'явіцца рэальная магчымасць для творчага і прафесійнага росту, што ў выніку прывядзе да паляпшэння матэрыяльнага дабрабыту. Дзейнічайце асцярожна, з халоднай галавой. Пазбягайце канфліктаў і спрэчак. Не рызыкуйце дарма, але і не прапускайце сваіх шанцаў.



**ДЗЕВА.** Досыць паспяховы тыдзень, хоць на вас і абрынецца лавіна разнастайных спраў ды клопатаў. Калі не будзеце з імі спраўляцца, то папрасіце дапамогі ў сяброў і калег. Не перагружайце сябе звышурочнай работай, ваша імкненне не ацэняць. Можаце апынуцца перад выбарам, па якой дарозе пайсці. Лепш аддаць перавагу новаму, а не хадзіць па крузе. Камандзіроўкі, паездкі і вандроўкі будуць удалымі ў сераду. Выхадныя пажадана правесці ў коле блізкіх людзей. Падзяліцеся з імі сваімі трывогамі, прыслухайцеся да парадаў.



**ШАЛІ.** Калі вы штосьці задумалі, то не тапчыцеся на месцы, збярыцеся з сіламі і рухайцеся наперад. Вельмі хутка знойдуцца пасажыры і памочнікі. Але не варта павялічваць працоўную нагрузку на гэтым тыдні. Займіцеся сабой. У чацвер адкладзіце сустрэчы і паспрабуйце звесці да мінімуму зносіны з навакольнымі. У суботу варта выбрацца на прыроду. Пажадана кантраляваць свае словы і ні з кім не спрачацца.



**СКАРПІЁН.** Дапамагаючы іншым людзям, зразумееце, як лепш справіцца са сваімі праблемамі. З'явіцца магчымасць адправіцца ў невялікую, але прыемную паездку, сустрэцца з каханым чалавекам. У сераду пры зносінах з дзелавымі партнёрамі вы адчуеце, што вас цэняць. Можаце разлічваць на салідны прыбытак. Нешаблонныя дзеянні і карысныя парады прынясуць поспех.



**СТРАЛЕЦ.** Не варта планаваць штосьці сур'ёзнае, дазвольце сабе расслабіцца і адпачыць. У асабістым жыцці ваша няпамятлівасць можа стаць прычынай напружанасці ў адносінах, так што аддайце ўвагу блізкім. На гэтым тыдні наогул на першы план выйдуць міжасобасныя адносіны — у вашых руках як паспяховае вырашэнне старых канфліктаў, так і стварэнне новых праблем.



**КАЗЯРОГ.** Тыдзень прынясе новыя жыццёвыя ўстаноўкі. Усё задуманае зможа спраўдзіцца, калі вы спакойна і выразна будзеце рабіць сваю справу. Перш чым складаць план дзеянняў, варта праверыць надзейнасць партнёраў. Не марнуйце час на пустыя размовы і плёткі. Паспрабуйце стварыць камфортную абстаноўку дома, не час пачынаць рамонт ці рабіць буйныя пакупкі, а таксама высвятляць адносіны з блізкімі.



**ВАДАЛІЎ.** Важна не кідаць словы на вецер. На рабоце паспрабуйце праявіць сябе з найлепшага боку. Верагодна вы станеце прадметам абмеркавання сярод калег, не варта даваць ім дадатковай нагоды для плётак. Другая палова тыдня спрыяльная для рэарганізацыі і пашырэння ўласнай справы. Падарожжа, якое пачнецца ў чацвер, можа стацца на рэдкасць удалым. Аднак пажадана захоўваць разумную ўмеранасць у сваіх жаданнях. Адзін з выхадных дзён прыйдзецца прысвяціць уладкаванню бытавых праблем.



**РЫБЫ.** Творчыя пошукі ўвянчаюцца поспехам, так што не бойцеся рызыкаваць і штосьці мяняць. Інакш вас зацягне дрыгва нуды. У сераду многія хатнія непрыемнасці застануцца ззаду, вы ўздыхняце з палёгкай. Могуць адбыцца змены ў асабістым жыцці. Калі будзе магчымасць, праявіце сябе ў новай справе, яна абавязкова прынясе вам поспех.

## Даты Падзеі Людзі

**5 ВЕРАСНЯ**




**1920** год — Камуністычная партыя (бальшавікоў) Літвы і Беларусі падзелена на самастойныя партыі — КП (б) Літвы і КП (б) Беларусі.



У гэты ж дзень нарадзіўся Аляксандр Рыгоравіч Філонаў, удзельнік баёў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза.

**1950** год — нарадзіўся Уладзімір Цярэнцьевіч Камкоў, артыст балета, педагог, народны артыст Беларусі. Працаваў у тэатрах оперы і балета Вільнюса і Харкава. У 1973—1995 гадах саліст Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі, адначасова ў 1981—1991 гадах выкладаў у харэаграфічным вучылішчы.

У гэты ж дзень нарадзіўся Іосіф Віктаравіч Залуцкі, вучоны ў галіне анкалогіі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар медыцынскіх навук, прафесар.

**1960** год — нарадзіўся Аляксандр Міхайлавіч Крот, беларускі вучоны ў галіне тэхнічнай кібернетыкі і інфарматыкі, доктар тэхнічных навук, прафесар. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

**2000** год — у сувязі са 160-годдзем з дня смерці беларускага паэта Францішка Багушэвіча мінскай бібліятэцы № 14 прысвоена яго імя, на будынку бібліятэкі ўсталяваная мемарыяльная дошка (скульптар Аляксандр Батвінёнак).




**1690** год — нарадзіўся Іаган-Данііл Шумахер, першы расійскі дзяржаўны бібліятэкар. Быў дырэктарам бібліятэкі Пецярбургскай акадэміі навук, якая пад яго кіраўніцтвам у 1740—1750-х гадах стала адной з найлепшых у свеце па паўнаце фонду, абсталяванні, якасці абслугоўвання чытачоў.

**1735** год — нарадзіўся Сямён Герасімавіч Зыбелін, першы рускі прафесар медыцыны Маскоўскага ўніверсітэта, адзін з заснавальнікаў прафілактычнага кірунку ў рускай медыцыне. Распрацаваў шэраг практычных мер папярэджання воспы і лячэння дзіцячых хвароб. Адзін з арганізатараў барацьбы з эпідэміяй чумы ў Маскве (1771). Праўдзейны член Расійскай акадэміі навук. З яго імем звязаны пачатак распрацоўкі рускай медыцынскай тэрміналогіі.



У гэты ж дзень нарадзіўся Іаган Крысціян Бах, нямецкі кампазітар і клавесініст.

**1905** год — Расія і Японія падпісалі ў Портсмуце (ЗША) мірны дагавор, які скончыў Руска-японскую вайну 1904—1905 гадоў.




**ГІЛБЕРТ ЧЭСТЭРТАН:**
*«Зладзеі шануюць уласнасць. Проста яны хочуць, каб яна належала ім дзеля яшчэ большай павагі да яе».*

Сезон

# Чакаюць бабёр, выдра, рабчык і шэрая курапатка

**З 1 верасня пачынаецца паляванне на бабра і выдру. Можна здабываць жывёл любога полу і ўзросту ружэйным (з падыходу, з засады) і безружэйным спосабамі. Паляванне дазволена кругласутачна, аднак у цёмны час паляваць ружэйным спосабам можна толькі ў прысутнасці службовай асобы карыстальніка паляўнічых угоддзяў, нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету.**

Пры ружэйным паляванні дазволена ўжываць наразную (з дульнай энергіяй кулі звыш 1500 джоўляў), гладкаствольную (з выкарыстаннем патронаў з карцеччу) і кідальную (паляўнічыя лукі і арбалеты) паляўнічую зброю. Пры безружэйным паляванні дазволена выкарыстоўваць капканы, пасткі (акрамя петляў), а таксама паляўнічых сабак (акрамя ганчакоў і хартоў).

У ходзе безружэйнага палявання на бабра і выдру дапускаецца здабыча норкі амерыканскай і андатры, якія выпадкова трапілі ва ўстаноўленыя капканы або пасткі. У кожным такім выпадку, перш чым дастаць жывёлу, паляўнічы павінен зрабіць адпаведны запіс на адваротным баку паляўнічай пуцёўкі — пазначыць від жывёлы (норка амерыканская альбо андатра) і дату яе здабычы (дату выяўлення ў пастцы). Калі ж у самалоў патрапіла паляўнічая жывёла нарміруемых відаў, на здабычу якой у паляўнічага няма дазволу, або гэта чырвонакніжнік, варта праінфармаваць аб гэтым супрацоўнікаў паляўнічай гаспадаркі, не дастаючы жывёлу з капкана або пасткі.

Сезон палявання на бабра і выдру працягнецца да 31 сакавіка 2021 года.

З 5 верасня (першая субота месяца) будзе дазволена здабываць рабчыка і шэрую курапатку. Паляваць на гэтых птушак можна таксама без абмежаванняў па поле і ўзросце, але толькі ў светлы час сутак. Спосабы палявання: ружэйны (з падыходу, з засады) з выкарыстаннем гладкаствольнай паляўнічай зброі і патронаў са шротам, паляўнічых сабак (выжлаў, спаніэляў, рэтрывераў); безружэйны — з дапамогай лоўчых птушак. Паляванне працягнецца да другой нядзелі снежня.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.25 | 19.50 | 13.25 |
| Віцебск — | 6.13 | 19.41 | 13.28 |
| Магілёў — | 6.15 | 19.40 | 13.25 |
| Гомель — | 6.14 | 19.34 | 13.20 |
| Гродна — | 6.41 | 20.04 | 13.23 |
| Брэст — | 6.44 | 20.03 | 13.19 |

**Месяц**

***Поўня 2 верасня.***
***Месяц у сузор'і Авена.***

**Імяніны**

**Пр.** *Калініка, Мікалая, Паўла, Яфрэма.*
**К.** *Дароты, Ваўжынца, Лаўрэна, Станіслава.*



Фота Віктара МІРОНЧЫКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Пятровіча пытаюцца:**

**— Павел, скажыце, што такое ўзрост для мужчыны?**

**— Ну, гэта ўсё проста! Калі жанчына ў туфлях, сукенцы і завушніцах падабаецца больш, чым толькі ў туфлях і завушніцах.**

— Як пазнаць чалавека бліжэй?

— Што тут складанага? Проста прыйдзі да яго з рэчамі!

**— Скажыце што такое сярэдні ўзрост?**

**— Гэта перыяд паміж канцом ілюзій маладосці і пачаткам галюцынацый старасці...**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2839.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 4 верасня 2020 года.